Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ВЕРАСЕНЬ 18 1933 г. ПАНЯДЗЕЛАК № 206 (4750)

Год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцесь!

СЕННЯ У НУМАРЫ:

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — На высокім прынцыповым узроўні. І. М. ШЭРМАН — Выкананне плана таваразвароту ў III квартале і перспектывы на IV квартал.

АГЛЯД ДРУКУ — За палітычную вастрату.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА — Большэвіцкая ідэйнасць, непрымірымасць да апартунізма, прыкладнасць на рабоце, высокая дысцыплінаванасць, — вось што партыя патрабуе ад комуніста.

Ліст т. т. ГІКАЛО і ГАЛАДЗЕДА ўсім сакратаром РК КП(б)Б і старшыням РВК.

ЗА МЯЖОЙ:

Міжнародная следчая камісія выкрывае сапраўдных падпальшчыкаў рэйхстага.

Куба ў агні рэволюцыйнага руху.

НА ВЫСОКІМ ПРЫНЦЫПОВЫМ УЗРОЎНІ

Перад камісіямі па чыстцы КП(б)Б прайшло ўжо звыш 20 тысяч членаў і кандыдатаў партыі, або каля 25 проц. усяго складу партыйнай арганізацыі Беларусі. Ужо праведзеная работа дала велізарныя станоўчыя рэзультаты. Чыстка паказала значны ідэйна-палітычны рост партыйнай арганізацыі ў цэлым, лішча вышэй узняла актыўнасць партыйных ячэек як у горадзе, так і ў вёсцы, у барацьбе за генеральную лінію партыі, за пастаянае правядзенне важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній, павысіла палітычную актыўнасць рабочых і калгасных мас, лішча цвёрдей згуртавала гэтым масы вакол партыі.

Маладыя ў масе сваёй большэвіцкія кадры Беларусі ідэйна ўмацаваліся і загартаваліся ў упорнай барацьбе з ворагамі большэвізма—з меншавікамі, эсэрамі, з контр-рэволюцыйным трацкізмам і правым апартунізмам. Асабліва багаты і значны вопыт барацьбы КП(б)Б з дробна-буржуазнымі нацыяналістычнымі партыямі, асабліва з Бундам і з контр-рэволюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам — простым агентам імперыялістычных інтэрвентаў, з усякімі праяўленнямі нацыянал-апартунізма, абапіраючагося шавінізма — за пашыраную нацыянальную палітыку, за пролетарскі інтэрнацыяналізм.

Падрыхтоўка да чысткі і самы працэс чысткі спрыялі значнаму павышэнню ўсёй палітычна-выхаваўчай работы. Там, дзе праверкамі правільна падыходзяць да праверкі палітычных ведаў, сходы па чыстцы ператвараюцца ў дасканалай школай палітычнага выхавання для ўсіх удзельнікаў гэтых сходаў.

Пры агульным бясспрэчным ідэйна-палітычным росце партыйнай арганізацыі ў цэлым, чыстка, аднак, выявіла сур'ёзныя недахопы ў арганізацыі і пастаноўцы палітычна-выхаваўчай работы ва многіх партыйных арганізацыях, а ў сувязі з гэтым і надзвычай нізкі ўзровень палітычнай пісьменнасці многіх членаў і кандыдатаў партыі, асабліва на вёсцы. Адзначаю не мала выпадкаў проста тупі абнаватычнага палітычнага невуцтва, асабліва нецярпімага ва ўмовах велізарнага культурнага і палітычнага роста рабочых і калгасных мас.

Чыстка спрыяла разгортванню большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі, выявіла не мала сур'ёзных недахопаў у рабоце партыйных арганізацый, савецкага і дзяржаўнага апарата, усярыла не мала людзей, чужых і нават варожых партыі, ашуканчым чынам пралезшых у партыйныя рады, буржуазных перараджэнцаў, кулацкіх агентаў, нацыяналістаў, нераззброіўшыхся бундаўцаў, прытаўшыхся нацдэмаў, троцкістаў, дэгенератаў, маральна разлажыўшыхся.

Пры гэтым адзначаю рад выдатнай сабатажа і нават простай змовы супроць чыткі з боку элементаў, маючых падставы баяцца праверкі партыйных радоў, каб не быць выведзенымі на чыстую ваду. Такія з'явы мелі месца ў горацкім с-г. інстытуце, у друкарні імя Сталіна і на электраатэнцыі ў Мінску, на гомельскім мясакамбінаце, на фабрыцы «КІМ» у Віцебску, у ячэйцы рабфака аршанскага чыгуначнага вузла, у ячэйцы медыка-санітарных устаноў Бабруйска і ў некаторых іншых месцах.

Гэтыя факты прубага зацюкі самакрытыкі, простага запалохвання, сабатажа і змовы супроць чыткі толькі рэзка падкрэсліві яе велізарную важнасць і значэнне. Факты гэтыя павінны стаць сур'ёзнай перасцярогай і прыкладам у далейшай рабоце па чыстцы КП(б)Б. Далейшая спроба прытупіць палітычную вострасць чыткі, асабліва яе ўдар па чужых і варожых партыі элементах, не вартых насіць высокую годнасць члена большэвіцкай партыі, павінна сустрэць самы суровы, самы бязлітасны адпор.

Галоўная работа па чыстцы ўперадзе. Прадпоўніць яшчэ праверыць каля трох чвэртак усяго складу КП(б)Б. Пры гэтым на чарзе чыстка ў важнейшых звеннях цэнтральнага савецкага і дзяржаўнага апарата.

Асаблівую ўвагу павінна прыкласці чыстка ячэек Наркамзема, і Наркамасьветы, з тым, каб да канца агаліць каранні надзейна ўскрытага контр-рэволюцыйнага шкоднічства і дзейнасці нацдэмаўска-прышчэпаўскага аховсця ў зямельных органах і органах народнай асветы. Увесь вопыт ужо праведзенай работы неабходна шырока скарыстаць, каб надаць чыстцы ў далейшым яшчэ большую палітычную завостранасць, каб яшчэ шырэй разгарнуць большэвіцкую крытыку і самакрытыку.

Між тым ёсць не мала фактаў, якія сведчаць аб «стомленасці» ад чыткі, аб прытупленні ўвагі да яе з боку некаторых партыйных арганізацый і ячэек, што шырока выкарыстоўваецца антыпартыйнымі элементамі ў сваіх мэтах.

Паказальная ў гэтых адносінах адтэрміноўка чыткі ячэйкі ДВБ. Тут аказалася не мала «замаскаваных» комуністаў, якім не падабаецца большэвіцкая самакрытыка, якія гатовы былі адпусціць здзін другому старыя грэхі. А «праходу» у рабоце ДВБ не мала. У сярэд час нацдэмаўшчына зяліла сабе тут даволі прытулнае гняздо. Выдзеўская працуюцыя ДВБ як нізавая, так і парыйная, была не ў малой меры засмечана «творчасцю» нацдэмаўскіх літаратараў, пры поўным прытуплянні пільнасці з боку комуністаў — кіраўнікоў ДВБ і асобных яго выданняў. Ці трэба паказаць, што тут самакрытыка была асабліва неабходнай, што ячэйка павінна была асабліва пільна падрыхтавацца да чысткі? А на справе прышлося чыстку адкласці, бо не быў забяспечан удзел у ёй пісьменніцкага актыва, а члены ячэйкі, прабавалі ўхіліцца ад «выяўлячэння» недахопаў работы ДВБ у цэлым і памылак пасобных яго работнікаў.

Толькі пры святле большэвіцкай самакрытыкі, пры ўдзеле мас, пры дапамозе іх дзелавой крытыкі можна выкрыць і выявіць замаскаванага апортуніста, перараджэнца, дэгенерата, шавініста, нацыяналіста, парушальніка партыйнай і савецкай дысцыпліны.

Рад партыйных камітэтаў па-ранейшаму не аддае неабходнай увагі чыстцы, а другія аслабілі гэту ўвагу, пічачы, што іх галоўная задача — забяспечыць поспех уборкі ўраджаю, загатовак, азімай сяўбы і іншых важных сельска-гаспадарчых кампаній, а з чысткай спра вяцца самі праверкомы. Не гаворачы ўжо аб тым, што чыстка партыйных арганізацый з'яўляецца сур'ёзнейшым фактарам павышэння актыўнасці членаў і кандыдатаў партыі ў барацьбе за ажыццяўленне гаспадарча-палітычных задач, што чыстка выклікала велізарны працоўны ўздым як на прадпрыемствах, так і ў калгасах, што яе ніяк нельга адарваць ад бягучай работы партыі, такое самаўхіленне ад актыўнага ўдзелу ў правядзенні чысткі з боку некаторых партыйных камітэтаў само па сабе прад стаўляе сур'ёзную палітычную памылку.

У некаторых партыйных камітэтах, як, напрыклад, у горацкім райкоме, не забяспечана было дзелавое супрацоўніцтва і дапамога праверкомам, а асобныя члены бюро горацкага райкома пашлі на паводу ў антыпартыйных элементаў, патрабаваўшых дыскрэдытаваць раённую камісію па чыстцы.

З такімі з'явамі неабходна рашуча пакончыць. Нельга забываць, што чыстка партыі адбываецца ў абстаноўцы абвостранай клясавай барацьбы і што мэйшае забяспечанне ўвагі да праверкі партыйных радоў з боку партыйных органаў пе вяду на мэты клясава-варожых і антыпартыйных элементаў, прабуючых сарваць чышчэнне партыйных радоў і ўзмацненне іх клясавай баяздольнасці перад тварам вялікіх задач другой пяцігодкі.

Усё яшчэ невыстарчальны ўдзел у чыстцы комсамольцаў, не гледзячы на ўказанні ЦК ЛКСМБ.

Як праверкомы, так і партыйныя камітэты павінны дабівацца, каб чыстка праходзіла на высокім прынцыпова-палітычным узроўні, пры актыўнейшым удзеле беспартыйных мас, каб яна з'явілася сапраўднай праверкай баяздольнасці і адданасці партыі і яе генеральнай лініі кожнай партыйнай ячэйкі, кожнага асобнага члена і кандыдата партыі, школай далейшай большэвізацыі ідэйна-палітычнага выхавання для маладых партыйных кадраў Беларусі, беспартыйных рабочых і калгасных мас.

Вялікая роля належыць у гэтай справе друку. Мы пічым неабходным, адзначаючы недахопы ў асвятленні хода чысткі на старонках нашага цэнтральнага і раённага друку, у парадку большэвіцкай самакрытыкі ўказаць перш за ўсё на нашы ўласныя недахопы.

У свой час «Правда» ў агляде «Звязды» зусім правільна ўказала нам на штампаванне матэрыялаў аб чыстцы, на адсутнасць сур'ёзных палітычных абагуленняў, на невыстарчальнасць прапагандыцкіх матэрыялаў, галоўным чынам па выкрыцці сутнасці дробна-бур жуазных нацыяналістычных партый, для якіх Беларусь у мінулым была буйной арэнай дзеяння.

Мы ўлічылі гэтыя правільныя ўказанні «Праўды» ў далейшай рабоце па асвятленні чысткі. Аднак, потым дапусцілі другую буйную памылку, адзначаную ў пастановах ЦК КП(б)Б і рэспубліканскай камісіі па чыстцы (гл. «Звязду» ад 4 верасня). Памылка гэта заключалася ў тым, што пры чыстцы некаторых кіруючых работнікаў КП(б)Б мы сталі на шлях толькі выхвалення іх большэвіцкіх заслуг, змазваўшы тым самым ролю крытыкі і самакрытыкі, змяншаўшы прынцыпова-палітычнае значэнне чысткі і не выявіўшы ролі партыі ў цэлым у падрыхтоўцы, выхаванні і выкаванні цвёрдых, адданых, выпрабаваных і самазвараных большэвіцкіх кадраў, выкінуўшых ёю на кіруючыя пасты.

Памылка наша заключалася ў тым, што захапіўшыся персанальным выхваленнем гэтых таварышоў, мы прайшлі міма тых памылак у беларускай партыйнай арганізацыі, на якія ўказвалася нам ЦК УсеКП(б) і «Праўдой».

Не зніжаючы сапраўдных і бясспрэчных заслуг гэтых таварышоў перад партыяй і іх большэвіцкіх якасцей, без якіх яны і ко маглі-б быць выпучаны на кіруючыя пасты ў КП(б)Б, мы абавязаны былі ў сувязі з чысткай кіруючых работнікаў беларускай партыйнай арганізацыі па-большэвіцку ўскрыць памылкі і прарывы, меўшыя месца ў рабоце КП(б)Б. Такое асвятленне чысткі кіруючага склада КП(б)Б мела-б вялізарнае выхаваўчае значэнне для ўсёй партыйнай масы і для ўсіх працоўных, якія змагаюцца пад кіраўніцтвам КП(б)Б.

Больш палітычнай вострасці, вышэй большэвіцкую самакрытыку і прынцыпова-палітычную вытрыманасць пры асвятленні ўсяго хода чысткі. Такава задача ўсяго нашага друку.

Вышэйшай задачай зараз з'яўляецца паспяшанне тэмпаў чысткі. Тэрміны сканчэння чысткі набліжаюцца, а праведзена толькі невялікая частка партыйнай арганізацыі. За апошні час у буйнейшых партыйных арганізацыях Беларусі — у Мінску, Гомелі і Віцебску— створаны дадатковыя камісіі па чыстцы. Гэта дазваляе фарсаваць тэмпы ўсёй работы, з тым, каб завяршыць яе ва ўказаўлены тэрмін.

Адначас, фарсуючы тэмпы чысткі, нельга дапусціць зніжэння якасці работы праверачных камісій. Далейшая работа па зніжэнні партыйных радоў павінна праходзіць на яшчэ больш высокім прынцыпова-палітычным узроўні, пры яшчэ больш разгорнутай крытыцы і самакрытыцы.

Толькі пры гэтай умове чыстка з'явіц ца важнейшым этапам у далейшым умацаванні і большэвізацыі радоў КП(б)Б, як аднаго з буйнейшых атрадаў вялікай ленінскай партыі, займаючага баявыя і адказныя пазіцыі ў барацьбе за сацыялізм.

Зламаць кулацкі сабатаж сяўбы пшаніцы

Зараз-жа і цалкам выканаць план сяўбы азімых

Пшаніца разбазарваецца на працадні

СІРОЦІНА. (Наш спецкор.).

Папрабуйце абвіншаваціць каго небудзь з кіраўнікоў раёна ў антышпанічных настроях. Наўрад ці ўдасца вам такая штука.

— Якія антышпанічныя настроі? Мы не толькі выдзелілі наркамзем ускі клін пасеву пшаніцы, дробязь іх яшчэ, мы далі сустрэчны ў 200 гектараў — сцвярджае загадчык райзо т. Семусевіч.

На словах, здаецца, людзі настроены вусім прыхільна да пшаніцы. Ну, проста такі «пшанічныя» людзі.

Але сапраўднасць зусім не адпавядае «пшанічным» настроям сіроцінскіх кіраўнікоў.

З месц ідуць трывожныя сігналы. Пшаніца не сеюцца. Пшаніцу замяняюць жытам. Азімая пшаніца разбазарваецца на працадні.

Калгас «Ударнік», Спаскага сельсавета, выканаў план па засеву азімкі-пшаніцы на 66 проц. Старшыня калгаса заяўляе:

— Болей сеяць не будзем. Няма насення. Дасеем потым.

Па самой справе ў гэтым калгасе ёсць сваё насенне. Пшаніца тут пашалам з жытам. Трэба толькі крыху папрацаваць, каб аддзяліць яе ад жыта.

У арцелі «Чырвоны сцяг», гэтага-ж сельсавета, не дасеяўшы па плану пшанічнага кліна, размеркавалі 7 пудоў азімкі сярод калгаснікаў.

Калгас «Зара свабоды», Лаўжанскага сельсавета, з 10-ці засеяў 5 гектараў.

— А як з астатнім?

— Засеем жытам. Нам даў такую ўстаноўку старшыня сельсавета тав. Саўчанка — адказвае старшыня калгаса Кавалёў.

Можна было-б прывесці дзесяткі такіх фактаў з практыкі калгасаў Сіроцінчыны. Даволі будзе паказаць на тое, што сем сельсоветаў да 10 верасня не ўкінулі ў зямлю ні аднаго каліва пшаніцы. Наркамзеўскі план раёнам выкананы усяго на 17 проц.

Прыняўшы сустрэчны план, тут палец аб палец не ўдарылі, каб яго выканаць. 16 тон пшаніцы раён атрымаў з Бешанковіч. Астатнюю павінны знайсці на месцы шляхам міжкалгаснага абмена. Але-ж абмен трэба арганізаваць, бо інакш справа не выйдзе.

БАР.

Азімы клін засеян

ЧЫРВОНАЯ СЛАБАДА.

Макранскі сельсавет першым у раёне 11 верасня поўнасцю засеяў азімыя — 231 га жыта і 80 га пшаніцы. Сяўба праведзена ачышчаным насеннем па добраўпорнай глебе. Гэта вынік большэвіцкай работы сельсавета на чале з тав. Гарбаўцом, вынік правільнага і ўмелага кіраўніцтва як калгасамі, так і аднаасобнікамі.

Падрыхтоўка да сяўбы ў Макранішчыне пачалася яшчэ ў ліпені. Планы сяўбы загадзя былі даведзены да калгасаў і аднаасобнікаў, пасеўныя абавязацельствы былі ўручаны кожнаму аднаасобніку. Вялікую арганізуючую ролю тут адыгралі ўпаўнаважаныя 20-дворак. Аднаасобнікі не адставалі ад калгасаў.

Прыклад Макранскага сельсавета паказвае, што пры ўмелым кіраўніцтве і правільнай арганізацыі працы сяўбу азімых можна закончыць у тэрмін.

В. Л.

Сяўбу адкладваюць да скончэння збожжаздачы

ПОЛАЦАК (Наш кар.)

— Не паспелі разгарнуць як слод збожжапастаўкі, а ўжо хутко, каб адразу скончылі сяўбу,—скарджацца старшыня Рудзянскага сельсавета Рагачоў.

— Скончым адно, потым возьмемся за другое—разважае Рагачоў.

А пакуль Рудзянскі сельсавет правядзвае і збожжапастаўкі, і асеннюю сяўбу.

— Мы ўсё зрабілі, усіх членаў сельсавета прымацавалі да калгасаў, сам штодзённа бываю ў калгасах,—запраўдваецца Рагачоў.

Пагадзім, як працуюць прымацаныя да калгасаў. Вось калгас «Соцыялізм». Прымацаваны да яго работнік лесгаспасга тав. Кампанец ні разу там не быў.

— У яго праруў па лесаўзвазцы, таму яму няма калі хадзіць у калгас,— прызнаецца Рагачоў.

Прымацаваны да калгаса «Новы свет» Бондзін, як толькі пачалася сяўба, пакінуў у адпачынак, проці прымацаваны захварэў.

Што-ж робіцца ў калгасах? У калгасе «Ленінскі прамень» яшчэ не засеяна 20 га азімых, у брыгадзе Хвежанкі на работу выязджаюць у 9 гадзін раніцы, а канчаюць у 6-7 гадзін, на абед 2-3 гадзіны. Для работы зусім не засталася часа.

Такое-ж становішча і ў калгасе «Чырвоны сцяг». Замест 120 га на 13 верасня засеяна 40 га. Калгас меў усе магчымасці закончыць сяўбу ў тэрмін, бо яравыя ўбраны. Але справа ў тым, што ў калгасе за апошні час заняпала працоўная дысцыпліна. На работу выходзяць калі каму ўздумаецца. Соцыялістычныя ляжавары, заключаныя ў пачатку сяўбы, не правяраюцца, усе яны ляжаць у партфалі старшыні калгаса. Чорную і чырвоную дошкі, якія дапамагалі калгасу ў часе веснавой сяўбы, зараз чамусці знялі.

Рудзянскі сельсавет мог своячасова закончыць сяўбу, але бяда ў тым, што тут яшчэ не зжыта апартуністычная практыка «чарговасці».

Асенняя сяўба адсоўваецца на задні план. Гэтага ніяк не хоча зразумець старшыня сельсавета Рагачоў.

Фрыд.

Зацягванне абмалота зрывае сяўбу

РЭЧЫЦА.

Рэчыцкі раён недапушчальна зацягвае асеннюю сяўбу. На 10 верасня было засеяна 33,7 проц. азімага кліна. Зрываецца сяўба пшаніцы. Засеяна ўсяго 22,4 проц. задання. Адной з прычын такога адставання з'яўляецца няўменне спалучыць важнейшыя асеннія сельска-гаспадарчыя работы. Для гэтага даволі спынімся на практыцы пасобных калгасаў.

У калгасе «Вызваленне» з 40 га засеяна 15. Сяўба затрымліваецца з-за таго, што не хапае насення. Старшыня калгаса Гаўрыленка, правёўны першы абмалот, супакоіўся. — «Зіма будзе вялікая, намалоцім», — заявіў ён. А зараз сяўба зрываецца з-за недамвата насення.

У калгасе «Мудрэц» замест 50 плугоў, якія штодзённа могуць выяжджаць у поле, фактычна працуюць 20-25. Падрыхтавана зямлі 41 га, угнойна 10 га. Не гледзячы на зацягванне сяўбы, 10 верасня, у нядзелю, калгаснікі паладзілі адпачынак.

У калгасе няма ні аднаго кіло ачышчанага насення ,у той час, як трыер пяць дзён прастаяў без работы толькі таму, што свячасова не падвезлі збожжа.

Р. П.

Усебеларуская чырвоная дошка

„Соцыялістычнае спаборніцтва гаворыць: Дапамагай адстаўшым, дагоняй лепшых і дабіся агульнага ўздыма"

(СТАЛІН)

Па прадстаўленні Сенненскага райкома КП(б)Б заносіцца на ўсебеларускую чырвоную дошку:

Калгас „ДАМАШЭВА", Немайцянскага сельсавета, Сенненскага раёна.

Гадавы план збожжапаставак калгас выканаў датэрмінова і поўнасцю. Калгас разлічыўся і за работу з МТС.

Уборка азімых і яравых праведзена ўдарна. Усе збожжавыя пасевы былі прапоратыя, лён прапалолі два разы. Увесь лён абмалочан і разослан. Поўнасцю ссыпаны насенныя, страхавыя і кармавыя фонды.

Дзякуючы добраму догляду за пасевамі і барацьбе са стратамі, кожны калгаснік атрымлівае на працадзень 7,5 кілограмаў збожжавых і 10,5 кілограмаў бульбы.

Лепшыя калгаснікі ўдарнікі: Галінка—старшыня калгаса, Валодзька—брыгадзір і Клімовіч С.

***

Па прадстаўленні Старобінскага РК КП(б)Б заносіцца на ўсебеларускую чырвоную дошку:

Калгас „ЧЫРВОНЫ ПАГРАНІЧНІК", Старобінскага раёна. Калгас поўнасцю датэрмінова выканаў гадавы план збожжапаставак, ссыпаў насенныя і страхавыя фонды.

На працадзень у калгасе прыпадае 4 кілограмы збожжавых і 8 кілограмаў бульбы.

Лепшыя калгаснікі ўдарнікі: Жыліч І., Сцешыц В., Грыцевіч С., Сцешыц Г.

СПРАВА, ПРА ЯКУЮ ЗАБЫВАЕ НАРКАМЗЕМ БССР

У БССР пачалася масавая ўборка бульбы. Запрасктаваны валавы збор бульбы дасягае велізарнай лічбы— каля 6.200.000 тон. Каб свячасова ўбраць і захаваць такую колькасць бульбы, забяспечыць ёю пролетарскія цэнтры ва ўмовах дадзклізай восені гэтага года патрабуецца выключная аперацыйнасць кіраўніцтва як з боку Наркамзема, так і раённых арганізацый.

На жаль, у Наркамземе аб бульбе ўспамінаюць толькі два разы ў год— вясной перад самай сяўбой і ўвосень перад самым капаннем.

Да чаго прыводзіць такая сістэма кіраўніцтва—можна ўбачыць на канкрэтных прыкладах.

Летась з-за нездавальняючага кіраўніцтва і кантроля з боку Наркамзема ў совгасах насеннаводтрэста і садагародтрэста былі разбазараны па спажывецкіх патрэбах дзесяткі тысяч цэнтнераў гатунковай насеннай бульбы. А вясною ва многіх раёнах гатунковай бульбы не хапіла па пасеў.

Паводле даных менскай бульбяной станцыі, гатунковая бульба павышае ўраджайнасць да 20 проц., паляпшаецца і яе якасць. Ва ўмовах БССР, дзе пад бульбу адводзіцца амаль чвэрта ворнага кліна, папырэнне гатунковых пасеваў мае актуальнейшае значэнне. Гэта тым больш важна, што паводле пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР, у 1935 годзе мы павінны перайсці на пасеў выключна гатунковай бульбы.

Паводле плана ў 1934 годзе БССР павінна засеяць 8.000 гектараў гатунковай бульбы выключна на насенне, апрача таварных пасеваў.

Каб забяспечыць гэтыя пасевы насенным матэрыялам, неабходна заразжа, калі пачаўся капанне, сабраць не менш мільёна пудоў гатунковай бульбы шляхам арганізацыі абмена паміж калгасамі і совгасамі.

Як-жа Наркамзем кіруе гэтым абменам? Нядаўна была апублікавана пастанова Наркамзема аб уборцы і хаванні бульбы, але пра гатунковую бульбу ў ёй не ўспамінаецца ні адным словам.

Дагэтуль па месцы яшчэ не разасланы нават планы абмена насеннай бульбы. Гэты план нават не складзен, бо Наркамзем сёння не ведае, колькі ў запраўднасці ёсць усяго пасеваў гатунковай бульбы ў БССР. І гэта ў той час, калі штогод на выяўленне гатунковых пасеваў бульбы трацяцца дзесяткі тысяч рублёў. Летась абследаннем даследчых станцый была ўстаноўлена паяўнасць насеннай бульбы ў 28 раёнах. Але, выявіўшы пасевы гатунковай бульбы, на гэтым супакоіліся. У далейшым работа па гатункаабмену—кантроль за скарыстаннем насеннага матэрыяла, улік засеяных плошчаў—не вялася. Таму Наркамзем зараз і блукае ў цемры.

Кантора Саюзнасеннавода сумесна з Наркамземам складае зараз куцы план татункаабмена паміж калгасамі толькі на 30 раёнах.

А як-жа з совгасамі?

— Яны нам не падначалены—вось адказ работнікаў Саюзнасеннавода.

Караней кажучы, тісторыя паўтарэцца. Мы зноў знаходзімся перад пагрозай разбазарвання гатунковай насеннай бульбы.

Паводле скромных падлікаў работніка Насеннаводтрэста тав. Трызна, у насеннаводчых совгасах пасля выкапання абавязкаў перад дзяржавай і ссыпкі насенфондаў застанецца лішніх 4.000 цэнтнераў гатунковай бульбы. У запраўднасці яе набярэцца больш. З кім абмяняць гатунковую бульбу—совгасы не ведаюць, бо такой дырэктывы не атрымалі.

Або возьмем совгасы садагародтрэста. У совгасах Тарасава (Менскі раён), Жылічы (Бабруйшчына), Дашкаўка (Магілёўскі раён)—усе пасевы бульбы гатунковыя. Гэтыя совгасы зараз пачынаюць адгружаць бульбу пролетарскім цэнтрам. Зразумела, было-б метазгодным гэтую гатунковую бульбу абмяняць з суседнімі калгасамі па звычайную. Але ўся бяда ў тым, што як у раёнах, так і ў Наркамземе гэтай справай ніхто не кіруе. Сменна сказаць: у Наркамземе дагэтуль няма спецыяліста па бульбе. Няма чалавека, які-б адказваў за гэту справу.

Пельга прайсці міма практыкі работы даследчых станцый. Менская бульбяная станцыя (дырэктар Кіпенварвіч) і кантрольна-насеннаводчая станцыя (дырэктар Сяргеенка) павінны былі даць весткі аб плошчах гатунковай бульбы яшчэ ў жніўні. Між тым толькі два дні таму назад імі дасланы весткі, але няпоўныя, якія не даюць запраўднага малюнка становішча на месцах.

Пара пакончыць з саматужніцтвам у планаванні і кіраўніцтве. Наркамзем павінен неадкладна прыняць меры, каб не паўтарылася мінулагодняя гісторыя. Мільён пудоў гатунковай насеннай бульбы для пасева будучага тода павінен быць собран і захован ва што-б там ні стала.

ЗОРЫН.

Адзін з перадавых калгасаў перадавога Чыстапольскага раёна, Татарскай рэспублікі, «Бахта» па-ўдарнаму выконвае пастановы партыі і ўрада аб набыцці для бескароўных калгаснікаў цялушак.

На здымку: старшыня калгаса «Бахта» тав. Мухудтэінаў перадае лепшай ударніцы калгаса Насці Пятуховай цялушку.

Бескароўныя калгаснікі атрымліваюць цёлак

ЛЕПЕЛЬ. Пастанова ЦК УсеКП(б) і СНК аб дапамозе бескароўным калгаснікам сустрэла жывы водгук у калгасах Лепельшчыны.

У калгасе «НОВАЕ ЖЫЦЦЁ», Сеннага сельсавета, сход аднагалосна па станавіў вылучыць тры цёлкі з МТФ і дзве закантрактаваць у калгаснікаў. Ранейшыя бядняки, якія ніколі не мелі кароў, а зараз лепшыя ўдарнікі і ўдарніцы калгаса Дзёмка Кастусь, Дзёмка Тацяна, Дзёмка Тодар, Клундук Мікола і Анашка Герасім атрымаюць цёлкі ва ўласнае карыстанне.

У калгасе «НОВАЕ ЖЫЦЦЁ», Крас налуцкага сельсавета, тром лепшым ударнікам ужо зараз адпушчаны цёлкі з абагуленага калгаснага стада.

Прапрацоўка пастановы выклікала вялікі ўздым сярод калгаснікаў. Ударнік калгаса «Новае жыццё» тав. Ермаковіч гаворыць: «З набыццём цёлкі я пачаў канкрэтна адчуваць, што праз калгас мы запраўды ідзем да заможнага жыцця. Буду яшчэ лепш працаваць, чым дагэтуль, каб не зганьбіць ганаровае імя ўдарніка».

Сярод бескароўных калгаснікаў раёна будзе размеркавана 700 цёлак. Для закупкі цёлак вызначан крэдыт у 25 тыс. руб.

АЛЕСЬ НАЛЁТНЫ.

АБ ПАРАДКУ АБ'ЯДНАННЯ НАРОДНАГА КАМІСАРЫЯТА ПРАЦЫ БССР З ЦЭНТРАЛЬНЫМ СОВЕТАМ ПРАФЕСІЯНАЛЬНЫХ САЮЗАЎ БССР

Пастанова Совета Народных Камісараў БССР і Цэнтральнага Совета Прафесіянальных Саюзаў Беларусі

У адпаведнасці з пастановай ЦВК СССР, СНК СССР і УсеЦСПС ад 23 чэрвеня 1933 г. «аб аб'яднанні Народнага Камісарыята Працы СССР з Усесаюзным Цэнтральным Советам Прафесіянальных Саюзаў» (З. З. СССР 1933 г. № 40, арт. 238) і пастановай СНК СССР і УсеЦСПС ад 10 верасня 1933 г. «Аб парадку зліцця Народнага Камісарыята Працы СССР з Усесаюзным Цэнтральным Советам Прафесіянальных Саюзаў» (газ. «Известия» ЦИК СССР и ВЦИК, № 225, за 11/IX—1933 г.). Совет Народных Камісараў БССР і Цэнтральны Совет Прафесіянальных Саюзаў БССР пастанаўляюць:

1. Перадаць з 15 верасня 1933 г. Цэнтральнаму Совету Прафесіянальных Саюзаў БССР і цэнтральным праўленням саюзаў:

а) усе сродкі социяльнага страхавання (72.659.000 руб. на 1933 г.);

б) усе санаторыі і дамы адпачынку з дапаможнымі гаспадаркамі, якія знаходзяцца пад ведамам Народнага Камісарыята Працы БССР і яго мясцовых органаў (у тым ліку органаў социяльнага страхавання);

в) усе навуковыя і навучальныя ўстановы НКпрацы і Соцстраха;

г) усе памяшканні НКпрацы і Соцстраха як у цэнтры, так і на мясцох;

УВАГА: Калі памяшканні НКпрацы ці Соцстраха займаюцца другімі арганізацыямі, то яны павінны быць неадкладна (у дакладны тэрмін) вызвалены і перададзены прафсаюзам.

д) кадры органаў працы і социяльнага страхавання;

е) усю маемасць НКпрацы і яго мясцовых органаў.

2. Арганізаваць пры цэнтральных праўленнях саюзаў галінныя касы социяльнага страхавання, а на прадпрыемствах і ва ўстановах—выплатныя пункты фабрычна-заводскіх і мясцовых камітэтаў па социяльным страхаванні.

Непасрэднае загадванне страхавымі касамі ўскласці на старшынь цэнтральных праўленняў саюзаў.

3. Ускласці на Цэнтральны Совет Прафсаюзаў БССР агульнае кіраванне справай социяльнага страхавання, кантроль і інструктаванне прафесіянальных саюзаў па пытаннях социяльнага страхавання.

Непасрэднае кіраванне ўсёй работай па социяльным страхаванні ўскласці на старшыню Цэнтральнага Совета Прафсаюзаў БССР, стварыўшы пры ім невялікі высока-кваліфікаваны апарат.

Для кіравання санаторыямі і дамамі адпачынку Цэнтральны Совет Прафсаюзаў БССР стварае гаспадарча-разрахунковую арганізацыю.

У гарадскіх і раённых прафесіянальных советах кіраванне справай социяльнага страхавання ўскласці непасрэдна на старшынь гарадскіх і раённых прафесіянальных советаў.

4. Уносы па социяльным страхаванні ўносяцца ўсімі плацельшчыкамі на рахункі адпаведных саюзаў у Дзяржбанку.

5. Захаваць за прафесіянальнымі арганізацыямі ўсе правы, льготы і перавагі, якімі карысталіся органы социяльнага страхавання да аб'яднання органаў працы з прафесіянальнымі арганізацыямі.

6. Захаваць за інспекцыямі працы права накладання штрафаў за парушэнне законадаўства аб працы.

Агульнае кіраванне інспекцыямі працы ўскласці на Цэнтральны Совет Прафсаюзаў БССР і на мясцох на мясцовыя советы прафесіянальных саюзаў.

7. Ускласці на Цэнтральны Совет Прафесіянальных саюзаў БССР і на мясцовыя советы прафсаюзаў рэгістрацыю калектыўных дагавароў, а таксама спасаванне тых дагавароў, якія супярэчаць законам.

8. Цэнтральны Совет Прафсаюзаў БССР падае ў Совет Народных Камісараў БССР заключэнне аб плане па працы (колькасць рабсілы, фонды заработнай платы, прадукцыйнасць працы), якое ўносіцца Дзяржпланам на зацвярджэнне СНК БССР.

9. Выдаткі Цэнтральнага Совета Прафесіянальных Саюзаў і саюзаў па выкананні новых функцый (соцстрах, ахова працы і г. д.) робяцца ў 1933 г. за кошт сродкаў, асігнаваных па каштарысах на ўтрыманне Народнага Камісарыята Працы, рэспубліканскай касы Соцстраха і іх мясцовых органаў.

Даручыць НК-РСІ, Народнаму Камісарыяту Фінансаў і ЦСПСБ у дакладны тэрмін вызначыць размеры неабходных сродкаў на 1933 г., значна скарацёўшы выдаткі на ўтрыманне апарата.

У далейшым Цэнтральны Совет Прафсаюзаў БССР складае і падае на зацвярджэнне СНК БССР каштарыс адміністрацыйных выдаткаў па социяльным страхаванні і ахове працы.

Старшыня Совета Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.
Старшыня Цэнтральнага Совета Прафсаюзаў БССР З. КАВАЛЬЧУК.

22 ВЕРАСНЯ—АДЗІНЫ ПРАФПАЛІТДЗЕНЬ

Для папулярызацыі пастановы СНК СССР і УсеЦСПС, а таксама СНК БССР і ЦСПСБ аб зліцці органаў Наркампрацы і Соцстраха з прафсаюзамі, 22 ВЕРАСНЯ АРГАНІЗУЕЦЦА на прадпрыемствах і ва ўстановах АДЗІНЫ ЎСЕБЕЛАРУСКІ ПРАФПАЛІТДЗЕНЬ. У дапамогу прадпрыемствам, згодна пастановы прэзідыума ЦСПСБ, мабілізуюцца ўсе адказныя прафработнікі. Адзіны прафпалітдзень павінен быць скарыстан, як масавая кампанія па агляду і ўзмацненні радоў страхавых дэлегатаў і грамадскіх інспектароў, для арганізацыі выплатных пунктаў і непасрэднай праверкі пераходзячай да прафарганізацый гаспадаркі Соцстраха. У дапамогу нізавым прафарганізацыям пры ЦСПСБ і гарайпрафсоветах арганізуюцца консультацыі па пытаннях зліцця і разгортвання далейшай работы па Соцстраху і ахове працы.

Уключаемся ў прадкастрычніцкую пераклічку

БАБРУЙСК, 14. (Па тэлефону).

Рэдакцыя газеты «ЗА ЎДАРНЫЯ ТЭМПЫ» — орган Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбіната ўключылася ў прадкастрычніцкую пераклічку прадпрыемстваў. Першы нумар газеты прысвечан прычынам прарыва на камбінаце. Дано выступленне ўдарнікаў лесацэха № 1 і лепшых рамшчыкаў, якія дзелацца з рабочымі сваім вопытам работы.

У наступным нумары ідуць рэзультаты правяркі работы лесацэха № 2, белдрэўцэха, пішы праведзена брыгадай ударнікаў камбіната.

Р

ДА АДКАЗНАСЦІ ЗА СУСТРЭЧНЫЯ ПЛАНЫ

Выправіць парушэнні новага закона аб цвёрдых збожжапастаўках!

СОВЕЦКІ ЗАКОН НЕПАРУШНЫ

Ліст у ЦО нашай партыі «ПРАВДУ» «Секрет» Мазырского райкома» павінен прыкаваць самую пільную ўвагу ўсіх беларускіх партарганізацый.

Што мы маем у Мазыры?

Злачынпейшае парушэнне новага закона аб цвёрдых збожжа дзяржаве. Каб прыкрыць ашуканства, якое мела месца ў раёне пры сяўбе азімых, раённыя арганізацыі сталі на шлях сустрэчных планаў.

ЦК нашай партыі і СНК не раз рашуча папярэджвалі, што ўсякае давядзенне сустрэчных планаў павінна карацца, як крымінальнае злачынства. Абавязацельствы па цвёрдых пастаўках азімага збожжа налічваюцца толькі з фактычна засеянай плошчы. Аб гэтым чорным на беламу запісана ў пастановах СНК СССР і ЦК УсеКП(б) аб цвёрдых збожжапастаўках, а таксама ў неадпаразовых дырэктывах СНК БССР і ЦК КП(б)Б.

А як паступаюць у Мазыры? Мінулай восенню раённыя арганізацыі прызначылі пасеўнага плана ашуканымі і ілжывымі рапортамі. І цяпер, каб захаваць свае злачынства, імкні майструюць сустрэчныя планы. Абавязацельствы па цвёрдых пастаўках азімых налічваюцца ў куды большым размеры, чым з фактычна засеянай плошчы.

І калі палітаддзел раённай МТС і раённая газета выкрываюць гэту агідпасць, райком становіцца на шлях зацкіна самакрытыкі.

Пускаюцца ў ход паклёпніцкія довады, нібы ёсць нейкія «сакротныя» дырэктывы аб тым, каб замаўчаць факт давядзення сустрэчных планаў.

Хто даваў такія дырэктывы? Хто забараняў выкрываць і неадкладна выціскаць малейшыя парушэнні новага закона аб цвёрдых збожжапастаўках?

Мазырскі райком выдае сябе з галавой, калі пускае ў ход версію аб «сакротных» дырэктывах. Зразумела, для таго, каб апраўдаць свае злачынствы.

Партыя і ўрад не раз і з асаблівай сілай адзначалі, што ўсякае давядзенне сустрэчных планаў павінна карацца, як крымінальнае злачынства, як кулацкая правакацыя. Нікому не дазволена парушаць совецкія законы. Яны непахісныя.

Мазырская справа набывае тым большае значэнне, што **Мазырскі раён не з'яўляецца выключэннем.**

Яшчэ ў пачатку жніўня на старонках «Звязды» выкрывалася нямала фактаў давядзення сустрэчных планаў. Напомнім пра іх.

Яшчэ 9 жніўня «Звязда» пісала, што полацкі райвыканком даводзіць сустрэчныя планы па азімых. Да калгасаў раённай МТС райвыканком даводзіць задаўні па цвёрдых збожжапастаўках наводле норм калгасаў, якія не абслугоўваюцца МТС. Што гэта, як не адна з форм сустрэчных планаў?

У адказ полацкі райвыканком абмежаваўся дыпломатычным маўчаннем. Ні слова, ні радка мы не атрымалі ад полацкага райвыканкома. **Што** зроблена па выкрытых злачынствах, як выпраўлены дапушчаныя памылкі — невядома. Райвыканком, а разам з ім і раённы камітэт партыі прамаўчалі.

Карэспандэнцыя, апублікаваная ў «Звязде» ад 16 верасня, дае зусім ясны адказ. Аказваецца, у Полацку не толькі не выпраўлены ранейшыя памылкі. Больш і горш таго. У раёне і цяпер практыкуецца давядзенне сустрэчных планаў. У карэспандэнцыі ад 16 верасня мы паведамлялі, што полацкі райвыканком зацвердзіў сустрэчны план для калгаса «Чырвоны колас». Калгас меў задание засеяць 5 гектараў бульбы і яго поўнасцю выканаў. А задание па цвёрдых пастаўках бульбы, зацверджанае полацкім райвыканкомам, даводзіцца на 9 га.

Або вазьмём Бешанковічы. З жніўня ў артыкуле «Скандаўшчына ў Бешанковічах» мы выкрылі абураючыя парушэнні новага закона аб цвёрдых збожжапастаўках. У гэтым раёне райземаддзел з ведама і пры простым патурэнні райкома і РВК давёў сустрэчныя планы да ўсіх без выключэння калгасаў. «Звязда» тады 3-га жніўня пісала:

«Бешанковіцкія раённыя кіраўнікі (пачынаючы ад райкома партыі і канчаючы ўпаўнаважаным СНК па загатоўках) сталі на шлях нахабнейшай, злачынпейшай дыскрэдытацыі закона аб цвёрдых збожжапастаўках».

Яны фактычна санкцыянавалі правакацыйную тактыку кулацкіх агентаў з райземаддзела, які павялічыў усім калгасам абавязацельствы па пастаўках азімага жыта на 10 проц. у парадку сустрэчных планаў.

Арганізатары гэтай нахабнай кулацкай правакацыі і іх патуральнікі, іх абаронцы, павінны прадстаць неадкладна перад пролетарскім судом. Буржуазныя перарадзкоўцы, якія прарваліся да руля раённага кіраўніцтва павінны панесці найстражэйшую адказнасць.

Бешанковіцкая справа — рашучае папярэджанне. Яна патрабуе настойлівай, пастаянай барацьбы супроць малейшых вылазак класавых ворагаў і іх агентаў, патрабуе рашучага ўзмацнення нашай класавай большавіцкай пільнасці».

Віноўнікі бешанковіцкіх сустрэчных планаў пакараны пакуль самымі драбнімі — некаторыя адхілены ад работы, а іншыя пакуль такога спагнання не атрымалі. Узнятая крымінальная справа супроць парушальнікаў совецкага закона дагэтуль марыцца ў Наркамюсце.

Тады-ж, у пачатку жніўня, мы выкрылі факт давядзення сустрэчных планаў з боку бабруйскага, ушацкага і некаторых іншых райвыканкомаў. Давядзенне сустрэчных планаў па азімых мае месца і ў Сіроцінскім, і ў Слуцкім, і ў Шклоўскім раёнах. Мы не атрымалі ад кіраўніцтва гэтых раёнаў ні радка аб тым, як выпраўляюцца дапушчаныя скажэнні і памылкі.

Мазырскі сігнал у «Праўдзе» — папярэджанне ўсім чапным арганізацыям. Партыя не пацерпіць давядзення сустрэчных планаў. Партыя сурова і бязлітасна ўдарыць па кожнаму, хто адважыцца парушыць совецкія законы. А што гэтыя спробы маюць месца і цяпер, аб гэтым красамоўна сведчаць матэрыялы, якія друкуюцца ў сённяшнім нумары «Звязды».

Трэба неадкладна і поўнасцю выправіць усе дапушчаныя скажэнні і пакараць канкрэтных вінаватых арганізатараў сустрэчных планаў.

Совецкія законы непарушныя. Аб гэтым трэба памятаць. Гэта трэба праводзіць у жыццё. Скарыстаем новы закон аб цвёрдых збожжапастаўках для рашучага ўкачэння тэмпаў выканання абавязацельстваў перад дзяржавай!

ДЗІЎНАЯ ЗАБЫЎЛІВАСЦЬ

У жніўні г. г. «Звязда» паслала мазырскай РКК-РСІ ліст з вёскі Барыскавічы, Прудкаўскага сельсавета. РКК расследвала гэту справу і прыслала ў рэдакцыю вывады камісіі і сваю пастанову. Большасць фактаў пацвердзілася.

Але чамусці РКК не лічыла патрэбным адказаць на факт замаўчанага парушэння ўстаноўленых законам пагектарных норм збожжапаставак, указаных у лісце.

Гэта «забыўлівасць» даволі пацаровая. Ці не тоіцца тут свядомае замоўчванне парушэнняў закона?

„САКРЭТ" МАЗЫРСКАГА РАЙКОМА...

(Ліст у „Правду" работнікаў палітаддзела Дамзнавіцкай МТС, Мазырскага раёна БССР)

Восенню мінулага года калгасы Мазырскага раёна засеялі 8.694 га жыта. Райземаддзел яшчэ да атрымання заключных справаздач калгасаў, жадаючы слісніць перад цэнтрам поспехамі, паведаміў у Наркамзем Беларусі, што калгасы засеялі 9.334 га, г. зн. на 640 га больш фактычнага пасева.

Райза і райвыканком пачалі на лаўрах лёгка здабытых перамог. Некалькі занепакоіліся яны толькі пры атрыманні плана збожжапаставак, які быў дан з разліка 9.334 га пасеву азімага жыта.

Каб прыкрыць сваю бяздзейнасць у кіраўніцтве слябой і «очковтирательство», РВК пускаецца на наступную «аперацыю». 22 красавіка было змайстравана рашэнне, якое павялічвала 50 калгасам план яравой сяўбы на 595 га. За кошт гэтага меркавалася прыкрыць раённую прарэху.

Рашэнне вынеслі і зноў супакоіліся. Таму дадатковы план застаўся ў райземаўскіх нетрах. Абавязацельствы-ж па збожжапастаўках калгасам былі выпісаны, выходзячы з павялічэння планаў. Такім чынам, калгасам далі сустрэчныя планы па збожжапастаўках у 640 га.

У райвыканком і ўпаўнаважанаму камітэта па загатоўках пасыпаліся заявы і скаргі. Але скаргі і па гэты дзень ляжаць у папках РВК неразгледжанымі.

Пасля перадавой «ПРАВДЫ» ад 14 ліпеня, у якой сустрэчныя планы кваліфікаваліся, як кулацкая палітыка, пасля ўрокаў Скадаўскага раёна, Адзінскай вобласці, пасля ўскрыцця таніхжа спраў у Бешанковіцкім і іншых раёнах Беларусі, райвыканком рашыў, што трэба нешта прадпрымаць.

Для ачысткі сумлення 26 ліпеня выносіцца рашэнне, якое зніжае 22 калгасам план збожжапаставак на 153 га; астатнія 442 га па-ранейшаму калгасы павінны пакрыць «сустрэчнымі планамі». Але і гэта рашэнне не было своечасова паведомлена калгасам, якія працягвалі пастаўляць збожжа па клапіраўленых абавязацельствах.

Раённая газета «КАЛГАСНІК МАЗЫРШЧЫНЫ», атрымаўшы сігналы аб сустрэчных планах, узялася за расследаванне гэтых фактаў і 10 жніўня ў перадавым артыкуле выкрыла ўсю кулацкую палітыку РВК.

Мы папярэдня гутарылі са старшынёй РВК тав. ЖОГАВЫМ, яго намеснікам, ведаючым загатоўкамі — тав. НОВІКАВЫМ і ўпаўнаважаным камітэта па загатоўках т. ЛЕВІНЫМ. Яны прызнаваліся, што адбылася «прыкрая памылка», але ні ў якім выпадку не хацелі прызнаваць існавання сустрэчных планаў.

Аднак гэта гутарка прымусіла кіраўнікоў РВК заварушыцца. 8 жніўня, ноччу, францыя РВК вынесла па гэтым пітанні рашэнне, але зноў наскрозь апартуністычнае, неканкрэтнае. Выехалі на «стрэлачніку». Вінаватым прызналі райагранома тав. БАНЯ, які быццам даваў весткі ў Наркамзем, хоць кожная зводка папярэдня правярэлася самім старшынёй РВК тав. Жогавым.

9 жніўня бюро райкома пад старшынствам загадчыка аддзела тав. КАГАНА прызнала наяўнасць сустрэчных планаў, «метало громы и молнии» не столькі па адрасе Жогава, Новікова і Левіка, колькі па адрасе загадчыка райза тав. РАДЗІВАНОВІЧА, замарынаваўшага дадатковыя планы веснавой сяўбы 50 калгасам. Дагаварыліся аб неабходнасці выправіць збожжавыя абавязацельствы калгасам, стварылі камісію для складання рэзалюцыі. І зноў ні слова аб прыцягненні вінадатых да адказнасці.

На другі дзень склікаецца другое пасяджэнне бюро райкома, ужо з удзелам сакратара тав. КЛІМЧУКА. Бюро прапанавала выправіць памылку, вынесла вымову старшыні райвыканкома, суровую вымову з папярэджаннем яго намеснику і заг. райза і вымову старшыні райплана тав. БАРКОЎСКАМУ і ўпаўнамоцанага тав. ЛЕВІНУ.

Прашло больш трох тыдняў, а пастанова ўсё яшчэ не была апублікавана. Спачатку быў прадлог: «рэзалюцыя яшчэ не адрэдагавана». А потым, тыдзень назад, тав. Клімчук адкрыў нам «секрэт», паведаміўшы, што «такая воля і думка ЦК КП(б)Б. Памылкі мы выправілем, сустрэчныя планы знімаем, але не публікуем свайго рашэння, каб не дэзарганізаваць збожжапастаўкі».

Сумневаемся, каб такая ўстаноўка выходзіла ад ЦК, але, як-бы там ні было, сакратар РК ухапіўся за гэты аргумент.

Мы яшчэ 9 жніўня паслалі ўвесь матэрыял аб сустрэчных планах у ЦО КП(б)Б — «Звязду», але ён да гэтага часа не надрукаван, і ніякага адказа мы не атрымалі.

Цяпер аб выпраўленні памылак. Калгасам, якім былі даны сустрэчныя планы, абавязацельствы перапісаны нанава.

Але гэтым справу нельга лічыць вычарпанай. Такія-ж сустрэчныя планы даны і многім аднаасобным гаспадаркам раёна. Амаль штодзённа ў райвыканком прыходзяць аднаасобнікі — сяляне са скаргамі на тое, што планы збожжапаставак ім вылічаны з такой колькасці зямлі, якой яны ніколі не мелі. Надаўна палітаддзелам МТС выяўлена, што Ліпаўскаму сельсавету, дзе засеяна 790 га, райвыканком даў план збожжапаставак з разліку 832 га пасева. Такіх фактаў у раёне нямала.

Райвыканком не палічыў патрэбным правяраць грунтоўнасць скаргаў сялян-аднаасобнікаў на сустрэчныя планы хоць-бы па адным населеным пункце. Свячыўся, што выпраўленне памылкі ў адным сельсавеце выклікна цэлы паток новых скаргаў і заяў.

По сігналах рабселькораў газета высунула рад сур'ёзнейшых пытанняў, патрабуючых карэннага пералома ў работе многіх калгасаў, сельсоветаў і раённых арганізацый. Асабліва шмат мы крытыкавалі работу райза. Ніхто ў раёне не палічыў патрэбным рэагаваць на матэрыялы нашай газеты, пакуль аналагічныя лісты не з'явіліся ў «Звязде». Толькі пасля гэтага выпучаліся камісіі, вялося расследаванне. У рэзультаце заг. райза ўжо атрымаў кара дзесяці вымоў, а становішча застаецца ранейшым.

Месяцаў пяць назад рэдакцыя звярнулася з адкрытым лістом да старшыні РКК-РСІ тав. ПІШЧЫКАВАЙ з просьбай дапаматчы ў барацьбе за разгортванне большавіцкай крытыкі і самакрытыкі і аб прыцягненні да партыйнай і судовай адказнасці некаторых раённых работнікаў з райза, райсаюза, райана і інш., якія ігнаруюць дзесяткі і сотні лістоў рабкораў і селькораў і скаргаў працоўных. У адказ мы атрымалі доўгую рэзалюцыю, старшыня райсаюза і загадчык райана атрымалі вымовы, а становішча не змянілася. Галоўныя вінаватыя ў зацыку самакрытыкі з кіраўніцтва РВК засталіся беспакаранымі.

На бюро райкома адказны рэдактар і яго намеснік з поезда сустрэчных планаў патрабавалі суровага пакарання вінаватых, аж да выкі очання з партыі і аддачы пад суд. Старшыня РКК-РСІ выплумачыў наша выступленне, як паход супроць усяго раённага кіраўніцтва і прапанаваў выклікаць з Менска камісію ЦК і ЦКК (чытай: для пакарання «стропцівых»).

Начальнік палітаддзела МТС не раз указваў на адміністраванне ўпаўнаважаных РК і РВК у вёсках, на загібы, адсутнасць мэсавай работы. Гэтыя ўказанні і заявы нікім не прымаліся пад увагу, таму што сам старшыня РВК з'яўляецца падтрымальнікам такіх метадаў. У часе веснавой сяўбы на нарадзе ў Дамзнавіцкім сельсавеце, калі некаторыя старшыні калгасаў прабавалі даказаць, што ў два дні яны наўрад ці выканяюць план пасева грэчкі, Жогаў прапанаваў тут-жа на нарадзе, дажурыўшаму міліцыянеру складаць пратаколы аб прыцягненні да адказнасці амаль што не кожнага кіраўніка калгаса і члена сельсавета.

У раёне з самакрытыкай справа стаіць не добра. У раёне па-свойму тлумачаць необходнасць сваячасовага і поўнага выпраўлення буйных парушэнняў дырэктыў партыі і ўрада, як гэта асабліва ярка выявілася са справай аб сустрэчных планах.

Нач. палітаддзела Дамзнавіцкай МТС ЦЫБЕРАЎ.

Пам. нач. палітаддзела ТРУШЫН.

Адк. рэдактар раённай газеты АНІШЧУК.

Нам. рэдактара РЫЎКІН.

Работнікі рэдакцыі:

Д. НІСЕНБАЎМ, М. ЖУК, ТЫЧЫНА.

(«ПРАВДА»).

КУЛАЦКАЯ АРЫФМЕТЫКА

ЖЛОБІН.

Член сельсовета вёскі Марусенка, Сенажацкага сельсовета, Р. ЯДЛОЎСКІ самавольна павялічыў плошчу азімых пасеваў. Ён склаў спіс сялян для давядзення абавязацельстваў па збожжы і кожнаму амаль у два разы павялічыў фактычную плошчу.

Г. АСТАЦЦКЕВІЧ засеяў 1,5 га. У спісе лічыцца 3,5; І. ЖАЎТОК засеяў 1,25 га, даны весткі аб 2,25; С. ГРАХОЎСКАМУ фактычная плошча пасеваў павялічана з 0,75 да 1,5 га.

Наогул, на 14 сялянскіх двароў прыбаўлена лішніх 13 га імі невасеянных.

Што гэта, як не злачынное парушэнне закона ўрада аб збожжапастаўках.

СЕЛЬКОРЫ.

7 ГА ПРЫБАВІЛІ

КЛІЧАЎ.

У маі гэтага года райагранам абмяраў плошчу азімага жыта ў калгасе «Ільіч», Грыбавецкага сельсавета. Аказалася засеянымі 27,9 га азімых.

План яравых пасеваў жыта ў гэтым годзе ў 13 га намі выкананы поўнасцю.

Такім чынам, уся плошча, занятая пад азімае і яравое жыта складае 40,9 га. Згодна пагектарных норм наш калгас «Ільіч» павінен здаць збожжа 30 цнтн. і 72 кг. Нам налічылі 36 цнтн.

Справа ў тым, што план збожжапаставак даведзен з разліка 35 га азімага пасева (абавязацельства нумар 0044544) 7 га прыбавілі.

Калі мы звярнуліся ў сельсавет і парт'ячэйку, нам сказалі: «Няма чаго таварыць пра планы, здавайце столькі, колькі даведзена па абавязацельствах».

Просім прыцягнуць парушальнікаў закона да адказнасці і прымусіць іх выконваць дырэктывы партыі і ўрада.

Калгаснікі.

ПАРУШАЛЬНІКІ ЗАКОНА

ГОРКІ.

Новы закон аб пастаўках збожжа цвёрды і непахісны. Ніхто ня мае права скажаць і парушаць яго. Класава-варожыя элементы імкнуцца дыскрэдытаваць закон, падарваць давер'е мас да яго.

У Горацкім раёне кулацкія агенты практыкуюць прыпісванне лішніх незасеянных гектараў азімай плошчы, уканоўваючы тэтым сустрэчныя планы.

Комуна «БЕЛАРУСЬ» у сваёй заключнай справаздачы, пасланай у райза, паведаміла, што летась ёю фактычна засеяна азімых 75 га. Збожжапастаўкі налічаны з 95 га. Комуна «Чырвоная ворка» засеяла мінулай восенню 90 га, ёй налічана плошча да 100.

Калгасу імя Чапаева план даведзен з разліка 52,7 га, замест фактычных 48,5. Калгасу імя трэцяга рашаючага—29 га замест 27 і г. д. Хіба гэта не злачынная кулацкая работа?

Н. ЧЫРВОНЫ.

НЕПАКАРАНАЕ ЗЛАЧЫНСТВА

ПУХАВІЧЫ.

Калгас «Совецкая Беларусь», Рудзенскага сельсавета, пасеяў восенню мінулага года 51 га жыта, 4 га пшаніцы. Аб гэтым ён своечасова паведаміў сельсавет. Якое-ж было здзіўленне калгаснікаў, калі праўленне атрымала задание на здачы збожжа. У абавязацельстве чорным на белым напісана: план паставак даводзіцца з разліка ў 67,4 га азімых. Гэта колькасць пасева была ў мінулым годзе выпачана па плану.

Такая-ж гісторыя здарылася з калгасам «Бжбожнік», тато-ж сельсавета. Агульны пасеў азімых складаў 59,4 га. Задание даводзена з разліка 67,4.

Нагадваем пухавіцкім арганізацыям і Рудзенскаму сельсовету, што закон прадугледжвае давядзенне заданняў па збожжы на аснове фактычна засеянай азімай плошчы; сустрэчныя планы караюцца, як злачынства.

П.

Усім сакратарам райкомаў КП(б)Б, старшыням райвыканкомаў

Законам СНК Саюза ад 16 жніўня г. г. устанаўліваецца новы парадак кредытавання тавараабароту, які ўступае ў сілу з 1 кастрычніка 1933 г.

СНК Беларусі і ЦК КП(б)Б звяртаюць увагу РК і РВК на вялікае прынцыповае значэнне гэтага мерапрыемства, якое выходзіць далёка за межы ведамстваных абмежаванняў паміж Дзяржбанкам і гандлюючай сістэмай. Закон гэты накіраван на далейшае разгортванне совецкага гандлю, паскарэнне прасоўвання тавараў да спажыўца і адарэнне фінансавай гаспадаркі гандлюючых арганізацый.

Партыя і ўрад новым законам усклаюць на Дзяржбанк выключна важную задачу—банкаўскім кредытам устанавіць строгі кантроль за дзейнасцю тавараразмеркоўчых арганізацый, максімальна садзейнічаць павышэнню і паскарэнню тавараабароту.

Паспяховае правядзенне ў жыццё новага парадку кредытавання тавараабароту патрабуе вялікай падрыхтоўчай работы з боку банка і гандлюючай сеткі (у асаблівасці спажыўкааператы). Кароткі час, які застаўся да 1 кастрычніка, трэба максімальна выкарыстаць для гэтай меты.

Неабходна тэрміново заступаць на бюро райкомаў кіраўнікоў банка і гандлюючых арганізацый (райсаюз, ЦРК, базы і інш.) аб ходзе падрыхтоўкі ў гэтых арганізацыях да пераходу на новы парадок кредытавання.

Асабліва напежыць звярнуць увагу на пытанні рэнтабельнасці, правільнага вядзення ўлікі і своечасовага складання справаздачнасці, зніжэння выдаткаў абарота, бо без гэтых асноўных умоў ніякая гандлюючая арганізацыя банкаўскім кредытам карыстацца не можа.

Необходна неадкладна правесці рад канкрэтных мерапрыемстваў па ўзмацненні фінансавага стану гандлюючых арганізацый.

ЦК і СНК падкрэсліваюць, што выкананне плана па тавараабароце ў IV квартале будзе ў значнай меры вызначацца тым, наколькі паспяхова будзе ажыццёўлен новы закон аб кредытаванні гандлюючых арганізацый. Іменне таму асабліваю адказнасць за правядзенне апошняга, апраче кіраўнікоў гандлюючай сістэмы і банка, ЦК і СНК усклаваюць на сакратароў райкомаў і старшынь райвыканкомаў.

Старшыня СНК БССР ГАЛАДЗЕД.
Сакратар ЦК КП(б)Б ГІКАЛО.

АБ ХОДЗЕ ДАРОЖНАГА БУДАЎНІЦТВА

Пастанова сакратарыята ЦК КП(б)Б ад 16 верасня 1933 года

1. Не глядзячы на неадпаразовыя пастановы ЦК КП(б)Б аб фарсаванні дарожнага будаўніцтва, рад райкомаў КП(б)Б (Копыль, Слуцак, Старыя Дарогі, Орша, Талачын, Асіпавічы, Дзяржынск, Смалявічы, Барысаў, Мазыр, Лагойск, Заслаўе, Сіроціна, Бабруйск і інш.) абмежаваліся фармальным вынясэннем рашэнняў па тэтым пытанні і не забяспечылі сапраўднага пералома ў справе выхада рабгужсілы на дарбудаўніцтва.

2. Абвешчаны пастановаю ЦК КП(б)Б ад 28 жніўня 1933 г. двухдзённік па скачэнні вывазкі дарожна-будаўнічых матэрыялаў агідна правалены, пры поўнай бяздзейнасці РК КП(б)Б і дарожных арганізацый, не забяспечыўшых канкрэтнага, аперацыйнага кіраўніцтва ходам дарбудаўніцтва.

ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Продоўжыць дзённік да 1 кастрычніка.

2. Папярэдзіць сакратароў РК КП(б)Б і начальнікаў дарбупучасткаў, што ў выпадку нестварэння імі пералома ў справе забеспячэння скачвання дарбудаўніцтва, ЦК КП(б)Б вымушан будзе ў адносінах адстаючых прыняць рашучыя меры ўзгаяння.

3. Абавязаць сакратароў РК КП(б)Б асабіста правяраць ход выканання праграмы дарбудаўніцтва і на працягу двухдзённіка асабіста забяспечыць кіраўніцтва гэтай важнай гаспадарча-палітычнай кампаніяй па скачэнні дарбудаўніцтва.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГІКАЛО.

ПАСТАНОВА РЭСПУБЛІКАНСКАЙ КАМІСІІ ПА ЧЫСТЦЫ КП(б)Б

Назначыць раённыя камісіі па чыстцы быхаўскай, лёзненскай, бешанковіцкай і старадарожскай партарганізацый у складзе наступных таварышоў.

БЫХАЎ:

Старшыня тав. **Кудзельскі** — член партыі з 1918 г., селянін, старшыня Вярхоўнага суда БССР. Члены — **Фальман А. І.**, член партыі з 1921 г., рабочы, сакратар парткалегіі жлобінскай райКК КП(б)Б; **Шарыпо**, член партыі з 1919 г., селянін, работнік Гістпарта.

ЛЁЗНА.

Старшыня—**Брэдзіхін Ф. П.**, член партыі з 1920 г., служачы, работнік ДПУ; члены—**Владзіноўскі**, член партыі з 1924 г., рабочы ст. Полацак; **Розаблюм**, член партыі з 1924 г., рабочы, старшыня лёзненскай райКК КП(б)Б.

БЕШАНКОВІЧЫ:

Старшыня—**Бяюмкін В. Л.**, член партыі з 1918 г., рабочы, старшыня полацкага райпрафсавета; члены — **Рутмуўскі П. У.**, член партыі з 1919 г., селянін, пам. нач. работ 97 буд. участка; **Будзевіч**, член партыі з 1924 г., рабочы, старшыня бешанковіцкай райКК КП(б)Б.

СТАРЫЯ ДАРОГІ:

Старшыня—**Зінкуў П. В.**, член партыі з 1920 г., рабочы, работнік ДПУ; члены—**Дыяг**, член партыі з 1919 г., служачы, сакратар парткалектыва курсаў партактыва; **Лукашэвіч**, член партыі з 1917 г., селянін, старшыня старадарожскай райКК КП(б)Б.

Старшынёю райкамісіі па чыстцы пухавіцкай партарганізацыі замест тав. **Цыпта**—назначыць тав. **Лук'янова І. В.**, члена партыі з 1917 г. (рабочы, работнік ДПУ).

Рэспубліканская Камісія па чыстцы КП(б)Б.

Аб авансаванні калгаснікаў грашыма ў лік размеркавання даходаў 1933 года

Пастанова Наркамзема БССР

1. Дазволіць праўленням калгасаў, не чакаючы агульнага размеркавання грашовых даходаў за 1933 г., выдаваць калгаснікам, побач з натуральнымі авансамі, якія выдаюцца згодна парадку, устаноўленага пастановай ЦК КП(б)Б і СНК БССР, грашовыя авансы па выпрацаваных працаднях, у памерах 20-30 процантаў сум, атрымліваемых калгасам за рэалізаваную прадукцыю.

2. Абавязаць усе райза і праўленні калгасаў забяспечыць побач з выдачай грашовых авансаў калгаснікам своечасовую выплату дзяржаўных плацяжоў па сельгаспадатку і страхоўцы і аплату ў тэрмін плацяжоў па кредытах 1933 г.

Народны камісар земляробства БССР БЕНЕК.

Справа менскай канторы Загатзбожжа

У сярэдзіне жніўня «Звязда» сігналізавала аб поўнай непадрыхтаванасці менскай міжраённай канторы Загатзбожжа да прыёмкі прадукцыі. На станцыі стварыліся «пробкі»; сотні ватонаў сушкамі чакалі разгрузкі. У вельмі дрэнным становішчы знаходзіліся загружаныя склады. Работнікі Загатзбожжа ссылалі збожжа без выканання элементарных правіл зберажэння прадукцыі. Пагражаючае становішча стварылася па млыне «Адраджэнне» трэста Саюзмукі, дзе бунты са збожжам стаялі на балоце.

«Звязда» патрабавала прыняцця рашучых мер да захавання збожжа і ліквідацыі «пробак» і паставіла перад сучыўнымі органамі пытанне аб прыцягненні вінаватых да адказнасці.

19 верасня ў клубе совецкіх і гандлёвых служачых менскі парсуд 1-га ўчастка будзе разглядаць гэту справу. Да адказнасці па абвінавачанні ў злачынных адносінах да падрыхтоўкі складаў і хаванні збожжа прыцягнуты інспектар складаў менскай міжраённай канторы Загатзбожжа Міруткі і намеснік дырэктара Белсаюзмукі т. Кудзіцер.

С. П.

М. І. ШЭРМАН

Выкананне плана тавараабароту ў III квартале і перспектывы на IV квартал

У сваіх неадпаразовых пастановах па пытаннях тавараабароту ЦК КП(б)Б і СНК БССР давалі рад канкрэтных указанняў як гандлёвай сетцы, у прыватнасці сістэма Белкаапсаюза, павінна перабудаваць сваю работу, каб забяспечыць выкананне плана тавараабароту. Асабліва востра гэта пытанне было пастаўлена перад гандлюючай сеткай у III квартале.

III квартал, які з'яўляецца рашаючым у справе рэалізацыі ўрадзкага і задачы збожжапрадуктаў дзяржаве, патрабаваў такога разгортвання тавараабароту, асабліва на вёсцы, якое забяспечыла-б выкананне важнейшых народна-гаспадарчых мерапрыемстваў гэтага квартала.

З гэтай важнейшай задачай спажывецкая сістэма Беларусі не справілася. Даныя аб ходзе выканання тавараабароту за 2 месяцы III квартала сведчаць аб вялікіх прарывах у гэтай галіне і сігналізуюць аб надзвычай марудных тэмпах работы Белкаапсаюза за ў адносінах перагляда метадаў і форм разгортвання савецкага гандлю ў горадзе і ў вёсцы.

З 80,5 млн. руб., якія раздробная сетка Белкаапсаюза павінна была выгандляваць у ліпені і жніўні, фактычна выканана 74,1 млн., або 92,1 проц., у тым ліку па вёсцы 95,1 проц. і па гораду 87,9 проц.

Такім чынам, раздробны гандаль недабраў за два месяцы 6,4 млн. руб. (па гораду 4,1 млн. руб. і па вёсцы 2,3 млн. руб.).

Не лепш стаіць справа з выкананнем гуртовага плана тавараабароту. План па міжраённых базах выканан на 60 проц., у тым ліку па гораду—55,6 проц. і па вёсцы—61,1 проц. Недабор такім чынам складае за два месяцы звыш 6 проц., або каля 3 млн. руб.

Асабліва дрэнна гандлявалі ў ліпені і жніўні магілёўская і віцебская базы, выканаўшыя: першая—36,9 проц. плана і другая—48,8 проц. Недабрала і гомельская база, даўшая выкананне тавараабароту на 58,8 проц.

У цэлым за два месяцы трэцяга квартала план тавараабароту выкананы: па вёсцы 56,7 проц. і па гораду 56,4 проц. Асабліва вызначаюцца Бешанковічы, Бабруйск, Гарадок, Магілёў і рад іншых райспажыўсаюзаў, у якіх процант выканання плана тавараабароту хістаецца ад 42 да 50. У рэзультаце невыканання плана тавараабароту касы дзяржаўнага банка недаатрымалі за ліпень і жніўень значнай сумы падатковых грошай: 10-12 млн. рублёў.

Між тым, ні ў адным квартале бягучага года абстаноўка для гандля не была такой спрыяючай, як іменна ў трэцім. Нізкі рост матэрыяльнай забяспечанасці працоўных, далейшае ўмацаванне калгасаў і рост дабрабыту калгаснікаў, добры ўраджай, поўная забяспечанасць банкаўскім кредытам,—усё гэта стварыла адпаведныя прадпасылкі для ўмацавання і пашырэння савецкага гандля як у горадзе, так і асабліва на вёсцы.

Чаму-ж гандлюючая сетка, асабліва сістэма Белкаапсаюза, дрэнна гандлявала і не выкапала плана тавараабароту?

Няма патрэбы паўтараць яшчэ раз усім вядомыя факты дрэннай пастаноўкі работы і дрэннага кіраўніцтва з боку цэнтральнага апарата гандлюючых арганізацый. Тут трэба галоўным чынам адзначыць, што галоўная прычына заключаецца ў тым, што дагэтуль аспоўнае звяно гандлюючай сеткі—рабкаапы і сельспажыўтавары ствы—у выніку адсутнасці аперацый пага кіраўніцтва не перабудавалі сваёй работы ў адпаведнасці з новымі ўмовамі і новымі патрабаваннямі, якія прад'яўляюцца спажыўцамі да савецкага гандля.

Да гэтага часа гандлюючыя арганізацыі не навучыліся даваць пакупцу тое тавар, які-б адпавядаў яго на прабажанню, яго густу і жаданню. Да гэтага часу мы яшчэ маем шматлікія выпадкі водпуску спажыўцу пагоднага тавара (Менск, Барысаў, Клічаў, Магілёў і рад іншых гарадоў і раёнаў). Зразумела, што такія адносіны да спажыўца не могуць спрыяць гандлю.

Вышэй мы адзначылі, што гандлюючая сетка дагэтуль не перабудавала сваёй работы ў адпаведнасці з новымі ўмовамі савецкага гандлю. Характэрнай у гэтых адносінах з'яўляецца работа, праведзеная Белкаапсаюзам пры прымацаванні сельспажыўтаварыстваў да міжрайбаз і баз прамысловасці.

Як вядома, для набліжэння нізавога гандлюючага звяна да спажыўчых арганізацый і лепшага яго абслугоўвання, было вырашана сельСТ прымацаваць да адбора і атрымання тавараў непасрэдна да міжрайбаз спажыўкааперацыі і баз прамысловасці. Здавалася-б, што гэта мерапрыемства павінна было быць праведзена загадзя з такім разлікам, каб да пачатку III квартала закончыць гэту арганізацыйную работу.

Аднак, гэта работа была праведзена з вялікім спазненнем, якое, бясспрэчна, шкодна адбілася на тавараабароце. Да гэтага трэба дадаць, што многія райсаюзы парат не перабудавалі сваёй работы ў адпаведнасці з гэтым і не пераключыліся на аперацыйнае кіраўніцтва сельСТ. У рэзультаце між райсаюзы правялі ў гэтых адносінах поўны сабатаж (Бабруйск, Шклоў, Сураж і інш.).

Няма ніякага сумнення, што на невыкананне плана тавараабароту мела ўплыў і дрэнная работа баз прамысловасці, несвачасова і няпоўнасцю снабжаўшых гандлюючую сетку прамтаварамі. Такама няма чаго таіць, што адсутнасць належнай увагі да пытанняў тавараабароту з боку раённых арганізацый і ў першую чаргу, з боку раённых партыйных камітэтаў, таксама спрыяла зрыву плана тавараабароту. Нам вядомы факты, калі ў ліпені і жніўні многія сельскія крамы знаходзіліся на замку толькі таму, што работнікі сельСТ былі мабілізаваны райкомам па розных кампаніі. І гэта рабілася пасля таго, як з боку ЦК былі даны адпаведныя ўказанні аб недапусцімасці такіх мабілізацый, пасля таго, як быў паслан усім раёнам ліст за подпісам т. т. Гікало і Галадзеда.

Тым не менш, не гэта з'яўлялася аспоўнай прычынай зрыву тавараабароту.

Галоўная прычына, паўтараем, хаваецца ў адсутнасці аперацыйнага і канкрэтнага кіраўніцтва гандлюючай сеткай, у няўменні і нежаданні перабудаваць сваю работу ў суадпаведнасці з новымі ўмовамі, няўменні скарыстаць для развіцця савецкага гандля спрыяючыя створаныя абставіны.

Апублікаваныя 16 жніўня раённні ўрада аб кредытаванні гандлёвых арганізацый па тавараабароту ставяць перад апошнімі па-новаму пытанні тавараабароту. Необходна перабудавацца знізу даверху, пераглядзець мэты і формы сваёй работы і поўнасцю выкарыстаць тыя спрыяючыя ўмовы для развіцця савецкага гандлю, якія, бясспрэчна, ствараюцца пры рэалізацыі паказаных пастаноў.

Жнівеньскае раённае ўрада даю гандлюючым арганізацыям магчымасць павялічыць свае накапленні, усіляць рэнтабельнасць гандля і паскорыць прасоўванне тавараў да спажыўца.

У адрозненне ад існаваўшага да гэтага часа кредытавання толькі сезонных патроб гандлёвых арганізацый урад абавязаў дзяржбанк кредыта

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Большэвіцкая ідэйнасць, непрымірымасць да апартунізма, прыкладнасць на рабоце, высокая дысцыплінаванасць,—вось што партыя патрабуе ад комуніста

НА ПАВАДУ У КУЛАКОЎ І ШКОДНІКАЎ

КОПЫЛЬ. (Наш кар.). Копыльскі ком соцкультуры быў перапоўнен комуністамі, комсамольцамі, рабочымі і калгаснікамі. Усе яны прыйшлі, каб прыняць удзел у чыстцы партыі.

Вось правяраецца **Басалыга Іван**—дырэктар копыльскай МТС. Паважна, ніха Басалыга расказвае сваю біяграфію. Яна не характарная, простая.

— Я член партыі з 1927 года. Працаваў з 1926 па 1929 год аграномам, а зараз працую дырэктарам МТС...

Слова «дырэктар» Басалыга як-бы падкрэслівае. Рэч вядомая: быць дырэктарам МТС—гэта пачэсная справа для большэвіка. Але як-жа працаваў дырэктар МТС Басалыга?

Няма ні аднаго нумара раённай газеты «Калгаснік Копыльшчыны», каб не было допіса аб засмечанасці калгасаў класава-варожымі, кулацкімі элементамі. У кожным нумары ёсць 1-2, а часта і больш допісаў аб кулацкай рабоце ў асобных калгасах. Асабліва засмечаны кулацкімі элементамі калгасы Бабаўшынскага, Райпэўскага, Пясочанскага, Вялешынскага і Копыльскага сельсоветаў.

Вось чаму на чыстцы можна было чуць такія запытанні да дырэктара МТС Басалыгі:

— Чаму разбазарылі свіней у калгасе «Перамога» і якія меры былі прыняты з боку дырэкцыі МТС?

— Ці ведаеце дзе і як працуюць машыны МТС?

— Чаму не праводзілася дыскаванне глебы ў калгасах?

—Як вялася барацьба за ахову соцыялістычнай маемасці як у МТС, так і ў калгасах?

— Чаму не прыняты меры да тых трактарыстаў, якія раскрадвалі газу?

І дзесятак іншых запытанняў, датычачых работы МТС, трактарных брыгад, работы ў калгасах, былі заданы правяраемаму Басалыгу.

На чыстцы выявілася, што **Басалыга камплектаваў апарат МТС з класава чужых элементаў.**

У МТС працавалі: **Казёл Ігнат** — кулак (загадчык майстэрні МТС), пад кулачнік **Чарноўскі** (старшы механік на рамонце сельска-гаспадарчых машын), старшым аграномам МТС доўгі час працаваў стаўленік кулакоў, шкоднік **Кароль Сцяпан**. Ён быў цесна звязан са шкодніцкай групай Наркамзема і Трактарацэнтра і праводзіў у МТС контр-рэволюцыйную работу. Карало актыўна дапамагалі сын лесапрамысловца аграном **Эйштэйн** і белы афіцэр **Страцевіч**, які працаваў памочнікам бухгальтара.

Гэтая група класава-чужых элементаў на працягу доўгага часа імкнулася разваліць работу МТС, праводзіла шкодніцкую работу, накіраваную на змяншэнне ўраджайнасці ў калгасах, псавала і выводзіла са строя трактары і інш. сельска-гаспадарчыя машыны.

Якую-ж пазіцыю займаў дырэктар МТС Басалыга? Калі толькі па ячэйцы паўставала пытанне адносна шкод ніцкай работы кулака Ігната Казла Басалыга, гэты абаронца кулака заяўляў:

— Казёл у нас спецыяліст і яго не троба чапаць.

Партыйная ячэйка МТС замест таго, каб да канца выкрыць гэтага кулацкага агента ў радах партыі, выкрыць усю групу кулакоў і шкоднікаў і па гэтым мабілізаваць рэволюцыйную пільнасць усіх комуністаў і рабочых МТС, праяўляла гнілы лібералізм. Дырэктара выклікалі на бюро, там яго «трэлі», але нічога канкрэтнага не прадпрымана.

На чыстцы выявілася, што Басалыга пад відам самазагатовак для рабочых МТС атрымліваў з калгасаў прадукты (сыр, масла, хлеб, бульбу) для сябе, скарыстоўваючы сваю пасаду дырэктара.

На сходзе выступіў начальнік палітаддзела т. Майсееў. З большэвіцкай праматой ён выкрываў усе недахопы ў рабоце дырэкцыі МТС.

— Басалыга страціў класавую пільнасць. Доўгі час арудавала ў МТС шайка шкоднікаў, якую «не заўважыў» Басалыга. Ён адарваўся ад рабочых МТС, груба абыходзіўся з імі, вытворчасці не ведае. У кіраўніцтве пераважваюць агульныя разважанні. Уліка маемасці няма. Часткі машын валяюцца дзе папала і прыходзяць у негоднасць.

Камісія па чыстцы выключыла бур жуазнага перараджэнца Басалыгу з раёну партыі. Але справа не толькі ў Басалыгу. **Тое, што на працягу доўгага часа на чале кіраўніцтва нозьлыскай МТС сталі яўна кулацкі стаўленік, сведчыць аб тым, што райком КП(б)Б не займаўся праверкай людзей, не кіраваў МТС, быў адарван ад яе.** Большэвіцкая самакрытыка ў МТС была закінута. Крытыкавалі, але глядзячы на асобы.

Палітаддзел МТС правёў вялікую работу да ачышчэння копыльскай МТС. Задача заключаецца ў тым, каб да канца вытрэціць усю гніль і вывесці копыльскую МТС на перадавыя пазіцыі барацьбы за большэвіцкія калгасы, за заможнае калгаснае жыццё. Партыйная ячэйка павінна перабудаваць сваю работу, мабілізаваць актыўнасць рабочых, спецыялістаў МТС і калгаснікаў на выкананне ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній.

Я. Лагоўскі.

ЗАМАЦАВАЦЬ ВЫНІКІ ЧЫСТКІ

Партыйная арганізацыя водніка ў Віцебскага раёна дабілася таго, што за 5 месяцаў навігацыі план грузаперавозак выканан на 110 проц. У маі месяцы прамфінплан не быў выкананы з прычыны нізкіх тэмпаў работы з пачатка навігацыі, за што раён быў занесён на чорную дошку. Мабілізаваўшы ўсе свае сілы, партарганізацыя ліквідавала прарыў, раён быў знят з чорнай дошкі і падалей не здае тэмпаў.

Аднак, самазаспакойванца няма ніякіх падстаў, бо недахопаў, а месцамі і вялікіх прарываў яшчэ вельмі і вельмі многа. Сонапаборніцтва і ўдарніцтва праводзіцца пакуль што фармальна. З 702 работнікаў, ударнікаў — усяго 78 чалавек. З 60 комуністаў толькі 8 ударнікаў.

Партыйная дысцыпліна слабая. Многія члены партыі сістэматычна п'янствуюць (**Казлоўскі, Гойлаў С., Нікалаеў, Сакалоўскі**), а сакратар ячэйкі райкіраўніцтва **Рэбікаль** нават дайшоў да таго, што з'явіўся на чыстку выпітшы. Членскіх узносаў многія не плацілі да года і больш (**Юрэвіч, Пінчулін, Іваноў, Гаспадарскі, Івашкевіч**).

Сямейнасць не дае магчымасці выявіць рад хваравітых з'явішч, развіцці якіх можа звесці да нуля дасягнутыя поспехі. Перад закрыццём навігацыі 1932 г. параход «Валкота» буксаваў 2 лайбы хлеба веліжскім рабочым, але з прычыны п'янкі, наладжанай пры актыўным удзеле комуністаў, адна з лайб была пакінута на зімоўку ў парогах. На параходзе знаходзілася 6 комуністаў: Рэбікель — плесавы механік і сакратар ячэйкі, Казлоўскі—нач. майстэрні, Іваноў—камандзір парахода, Пеступ В.—нам. кам. парахода, Гайлоў—машыніст парахода і Былінскі качатар,—але яны працуцілі гэты ганебны факт скрозь пальцы. Толькі напярэдадні чысткі ўсё выпла на чыстую ваду. Казлоўскі правальваў работу майстэрні, не забяспечваў скалачэння ў тэрмін зімовага сударамонта.

На паасобных адзінках квітнее сістэматычная пакража грузаў (параход «Веліка»), безбілетны праваз пасажыраў (параход «Валкота», «Тарона», а комуністы, працуючыя на іх, не вялі з гэткімі з'явішчамі ніякай барацьбы (Байдак, Іваноў, Бараноўскі) і нават самі займаліся гэтым (Пяступ В.).

Палітвучобу як зімой, так і летам наведвалі кепска. У выніку значная частка комуністаў на чыстцы аказалася палітычна няпісьменнай (**Левінскі, Казлоўскі, Пейц** і інш.) Напрыклад, **Захараў** не адказаў на пытанне, хто такі т. Сталін.

Цяпер баявым экзаменам для водніка ў з'яўляюцца асенція перавозкі. І тут не ўсё у парадку. Аб'ём перавозак яшчэ не вядомы. Не хапае 30 грузчыкаў і кала 60 сплаўшчыкаў. Меры ў гэтым напрамку не прымаюцца. Мерапрыемствы па перабудове работы рачнога транспарту намечаны, але яшчэ не рэалізаваны.

Партарганізатар раёна т. **Рудзінскі** праяўляе мяккацеласць і лібералізм да асобных комуністаў, не па-большэвіцку выконваючых сваю работу.

Крытыка і самакрытыка амаль зусім адсутнічае. У гэтым напрамку чыстка дала зрух, але ён зусім недастатковы. Пры чыстцы кіруючых работнікаў—Рудзінскага і Баскіна—адзначалі толькі іх добрыя бакі.

Чыстка водніцкіх партячэек працягвалася два тыдні. Да моманта чысткі налічвалася 60 комуністаў (48 членаў і 12 кандыдатаў), з якіх 16 чал. працуе ў апараце (26,6 проц.) і 44 ч. на вытворчасці (73,4 проц.). Па партстажу арганізацыя зусім маладая. З 1929-32 г. г. — 33 чал., а з 1918-1919 г.г. толькі 3 чал. Прайшло чыстку 57 чал. Выключана з партыі 11 чал.—19,3 проц., пераведзена ў кандыдаты—5 чал.—8,7 проц. і ў спачуваючыя 4 чал.—7,0 проц.

Правяркою выключыў з партыі, як перараджэнцаў, п'яніц і дэзарганізатараў вытворчасці Рэбікеля (б. сакратара ячэйкі), Казлоўскага, Іванова, Гайлава, Пеступа і інш.

Вось выключаны з партыі **Сакалоўскі Г. К.** Ён служыў у армії Калчака. Да службовых абавязкаў адносіцца дрэнна, сістэматычна п'янствуе. **Юрэвіч А. В.** пядаўна меў аварыю парахода. Будучы вартаўніком сталовай, ён дапусціў крадзеж. **Нікалаеў А. М.** сістэматычна п'янствуе, парушае працэсцыпліну (аллучкі на бераг для п'янства), не ўключае парт узносаў і адарваўся наогул ад партжыцця.

Былі спробы скарыстаць чыстку для звядзення асабістых рахункаў. Рабілі гэта тыя людзі, якім комуністы перашкаджалі разбазарваць дзяржаўную маемасць (**Журынскі, Альшанка**). Але іх спробы былі адразу выкрыты.

Чыстка аздаравіла партарганізацыю водніка ў, падняла актыўнасць рабочых і служачых. Задача ячэйкі заключаецца ў тым, каб да канца зжыць сямейственнасць у рабоце, падняць класавую пільнасць комуністаў і беспартыйных актывістаў, узмоцніць ідэйна-палітычны ўзровень членаў і кандыдатаў партыі.

МЕНСКІЯ БОЛЬШЭВІКІ ПАВІННЫ ЗРАБІЦЬ ЧЫГУНАЧНЫ ВУЗЕЛ ВАРТЫМ СТАЛІЦЫ БССР

Гутарка з начальнікам палітаддзела МББ чыг. тав. Доненко

У Менску апошнія некалькі дзён знаходзіўся начальнік палітаддзела МББ чыг. тав. ДОНЕНКО.

У гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» тав. Доненко паведаміў:

— Менскі вузел усё яшчэ працуе дрэнна. Сігналы «Праўды» аказаліся нелачутымі, большэвіцкія вывады не зроблены. Работа ўсё яшчэ праводзіцца старымі, канцылярска-бюракратычнымі метадамі.

Самая вялікая неблопка заключаецца ў тым, што перад таварам усіх наяўных буйнейшых недахопаў «работнікі чыгуначнага транспарта ў сваёй большасці не заўважаюць гэтых трывожных адзнак, а хто бачыць, стараецца іх замаскаваць, не ўскрывае, не ліквідуе».

Большэвікі Менскага вузла не разумеюць, што іменна яны і беспартыйныя актывісты — асноўныя вінаватыя ў ганебнай рабоце вузла.

У чым гэта праяўляецца?

Многія з комуністаў чыгуначнікаў не з'яўляюцца ўдарнікамі. У вагонным дэпо больш 1/3 комуністаў і комсамольцаў — няўдарнікі. У механічным цэху заводу імя Мяснікова з 13-ці комуністаў ударнікаў толькі тры, а з 29 комсамольцаў — 9.

Ніякага зрыва ў разгортванні крытыкі і самакрытыкі няма. Сапраўдная барацьбы за ліквідацыю недахопаў, за выкрыццё і разгром сабатажнікаў не адчуваецца.

Кіраўніцтва паравознага дэпо разбазарвае фонды грамадскага харчавання, выдае хлеб без усякіх норм. Гэта злачынства было выяўлена толькі два дні таму назад, і то выпадкова. Дэпо зусім не ахоўваецца. Цэлая секцыя дэпо 16 верасня прастаяла некалькі гадзін і не было ў секцыі ні аднаго чалавека. Двое ры зусім расчынены і можна было сцягнуць хоць паравоз.

З такім-жа становішчам прышлося сустрэцца ў ФЗВ чыгуначнікаў. Мы прасталі ў стаярным цэху 45 мінут, але не бачылі ні аднаго чалавека. І гэта не гледзячы на тое, што ў гэтымжа памяшканні знаходзіцца інструментальная.

Агіднае становішча з рабочым снабжэннем. І не тому, што прадуктаў мала, а тому, што не навучыліся працаваць, што правальваюць самаабгатоўкі. Пагардлівыя адносіны да грамадскага харчавання прывялі да таго, што ў некаторыя сталоўні Менскага вузла проста агідна зайсці, а тым больш абедаць. Сцены закопчаны, падлогі запляваны, бруд і смурод.

Такія з'явы на ўчастку рабочага снабжэння выклікаюць трывогу. Кожны начальнік станцыі, завода, дэпо, кожны прафсаюзнік павінны запамятаць, што яны ад пачатка да канца адказваюць за снабжэнне. Большэвік, арганізатар мас не можа стаяць у баку ад такога важнейшага гаспадарча-палітычнага ўчастка, як снабжэнне рабочых. Большэвіку-гаспадарніку не павінна быць зазорна палазіць па магазінах і сталоўках, высветліць, чаму там чаргі, чаму не хапае начыння, чаму дрэнная якасць стравы. Трэба таксама паглядзець, хто тыя людзі, якія працуюць у магазінах і сталовых.

Парт. і палітдні на транспарце павінны быць пачаткам магутнага разварота соцыялістычнага спаборніцтва, магутнага ўздыму актыўнасці чыгуначнікаў у барацьбе за сапраўдную перабудову транспарта, як гэтага патрабуюць партыя і ўрад, у барацьбе за сцяг цэнтральнага органа партыі — «Праўды».

На Менскім вузле гэтага не зразумелі. Партдзень, які адбыўся 16 верасня, быў падрыхтован дрэнна.

Вагоннае дэпо як быццам палепшыла



работу. У верасні не было ні аднаго прагула. Праграма выконваецца. Але якасць усё яшчэ не на вышыні, зрух у гэтым напрамку нязначны. Няма яшчэ сапраўднай большэвіцкай барацьбы за вагон.

Вагоны прастойваюць. 14 верасня на ст. Менск сталі нявыгружанымі 151 вагон, 15 верасня — 150. Тым часам, кожны неразгружаны свячасова вагон — злачынства. Пасажэнне зварота вагонаў мае рашаючае значэнне для выканання плана перавозак, для паляпшэння работы ўсяго транспарта. Прастой вагонаў, марудны зварот іх вырывае з-пад пагрузкі сотні і тысячы вагонаў, якіх якраз не хапае для выканання плана пагрузкі збожжа, бульбы і гародніны.

Гарадскія арганізацыі павінны аказаць актыўную дапамогу, асабліва ў разгрузцы прырэйкавых складаў. Гарком партыі з гэтага повада прыняў рад канкрэтных рашэнняў. Неабходна яны можна хутчэй правесці іх у жыццё.

Асабліва агідныя фанты маюць месца на вагона-рамонтным заводзе імя Мяснікова. За першую дэкаду верасня план выкананн на 64 проц. Найбольш адстаючы цэх — пасажырскі, раманту ючы манчжурскія экспрэсы. Арганізацыя працы тут нікуды не вартая, людзі таўкуцца без справы. Не ліквідаваны буйнейшыя скажэнні ў зарплаце. У малярным цэху майстар атрымлівае 120 руб., вучань 150 руб.

На гэтым-жа заводзе каштоўнейшы імпартны варштат для абточкі колаў ляжыць каля месяца неўстаноўленым. Не выкапан нават катлован. Між тым, рабочыя не раз прапанавалі правесці суботнік па ўстаноўцы варштата. Сабатажнікі спасылаюцца на тое, што няма 10 бочак цэмента і некаторай колькасці цэглы.

У рабоце прафсаюзных арганізацый вузла адчуваецца бесхрыбетнасць, беззубасць. Няма сапраўднай барацьбы за рэалізацыю дырэктыў 9 з'езда прафсаюзаў, за правільную арганізацыю працы, за тое, каб ударніні атрымалі больш, лепш снабжаліся, каб аб іх больш турбаваліся.

Да гэтага часа некаторыя члены партыі не разумеюць ролі і задач палітаддзелаў, якія створаны ЦК партыі для таго, каб навесці на транспорце большэвіцкі парадок, ачысціць яго ад класава-варожых элементаў, перабудаваць партыйна-масавую работу, устанавіць свядомую жалезную працоўную дысцыпліну. Такія члены партыі не разумеюць, што палітаддзелы — гэта вока і кантроль партыі, які павінен вывесці чыгуначны транспарт на шырокі шлях і пакончыць з недахопамі.

Кожны комуніст павінен зразумець, што калі ён не ліквідуе развал работы на сваім участку, ён не можа быць у партыі. Не месца ў партыі таму комуністу, які не з'яўляецца ўдарнікам, не месца ў комсамоле комсамольцу, калі ён не ўдарнік.

Партыйныя і комсамольскія арганізацыі менскага вузла павінны стварыць такое слабе моцны беспартыйны актыў. Трэба дабіцца, каб майстар стаў сапраўдным гаспадаром у цэху, каб пытанні ўвядзі работы цэхаў не толькі прапрацоўваліся, але, нарэшце, праводзіліся ў жыццё.

Газеты, клубы, чырвоныя кутні, масавая работа, — усё гэта павінна быць падпарадкавана інтэрэсам перабудовы, мабілізацыі арасці мас такое канкрэтных фактаў парушэння працэсцыпліны і пажара лепшых ударнікаў, сапраўдных носітаў пролетарскай дысцыпліны.

Аб выніках чысткі ячэек Гарадоцкага лестрангаса і райспажыўсаюза

Пастанова рэспубліканскай камісіі па чыстцы КП(б)Б ад 15 верасня 1933 г.

Чыстка ячэйкі Гарадоцкага лестрангаса і райспажыўсаюза выявіла значную засмечанасць апарата ЛТК класава-чужымі і кулацкімі элементамі, арыгінальнага прамфінплана, факты сямейнасці і заціска самакрытыкі, ігнараванні рэда партыйцаў — дырэктара ЛТГ Калады, сакратара ячэйкі Ніфёрава, старшыні райкома саюза леса Окуматава і інш.—з чужымі элементамі і адсутнасць партыйнай і масава-выхаваўчай работы.

У сістэме спажыўкааперацыі, а таксама і па ЛТГ ускрыты пазіцыі продуктаў і фуража і растраты каапераціўных сродкаў (па ЛТГ 17 тыс., па кааперацыі 29 тыс.).

Адначасова камісіяй па чыстцы партыі выяўлена, што з боку раённага кіраўніцтва—РК, РВК і асабліва РКК КП(б)Б праяўляліся ліберальныя адносіны да фактаў сямейнасці, заціска самакрытыкі, расхрадання дзяржаўнай маемасці ва ўказаных арганізацыях. Судова-следчыя органы раёна дапусцілі скрыўленне пролетарскай законнасці, не вялі барацьбы з растратамі і расхрадаваннем соцыялістычнай маемасці, судовыя справы аб растратах не разглядаліся па 10—12 месяцаў.

Рэспубліканская камісія па чыстцы **ПАСТАНАЎЛЯЕ:**

1. Ухваліць мерапрыемствы гарадоцкай камісіі па чыстцы ячэек ЛТГ і райспажыўсаюза і своечасовую сігналізацыю аб ускрытых фактах перад рэспубліканскай камісіяй.

2. Прапанаваць камісіі правесці на-ве чарговую чыстку ячэйкі пракуратуры і міліцыі, у сувязі з выявіўшымися фактамі скрыўлення рэволюцыйнай законнасці, а таксама тых работнікаў, якія мелі дачыненне да самаснабжэння і разбазаравання прадуктаў, паставіўшы пытанне аб вінаватых з усёй рашучасцю, выходзячы з пастановы ЦК і ЦКК аб ачыстках чысткі партыі.

3. Прапанаваць рабочай камісіі па чыстцы матэрыял аб незаконных дзеяннях б. старшыні гарадоцкага РВК Будасьева і інш. работнікаў, выехаўшых з раёна—перасунуць на месцы іх новай работы—старшынямі раённых камісій па чыстцы.

4. Члена раённай камісіі Лазоўскага, старшыні РКК-РСІ дапусціўшага ў сваёй рабоце прытупленне класавай пільнасці і ліберальныя адносіны да кулацкай работы ў ЛТГ—зняць з работы па чыстцы і прасіць прэзідыум ЦКК КП(б)Б тэрмінова разгледзець пытанне аб яго рабоце ў КК-РСІ.

5. У сувязі з выяўленымі фактамі пагушэння рэволюцыйнай законнасці,—паслаць спецыяльную камісію для абследавання работы судова-следчых органаў.

6. Прапанаваць усім гарадскім і раённым камісіям па чыстцы ў сваёй рабоце з большай пільнасцю правяраць правядзенне рэволюцыйнай законнасці, а так сама работу каапераціўных і гаспадарчых арганізацый, ведучы бязлітасную барацьбу з фактамі злоўжывання, растрат, самаснабжэння і растрачвання дзяржаўных і каапераціўных грашовых і матэрыяльных сродкаў.

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б

САХАРАВА, ЛЫЧОЎ.

АГЛЯД ДРУКУ

ЗА ПАЛІТЫЧНУЮ ВАСТРАТУ

„Ленінскі прызыў"—Орша

У аршанскай партарганізацыі чыстка падыходзіць да канца. За апошні месяц чыстка партыі ў Оршы праходзіла пры адчайным супраціўленні буржуазна-перараджэнцкіх элементаў. Было шмат выпадкаў змоў, сабатажа, заціска самакрытыкі. У некаторых ячэйках прышлося праводзіць чыстку паўторна.

Аршанская газета «Ленінскі прызыў» не прайшла міма ўсяго гэтага. Усе факты змовы, заціска самакрытыкі і сабатажа чысткі **так ці інакш** знайшлі асвятленне ў газеце.

Так ці інакш. Падкрэсліваем гэта.

Вось перад намі камплект аршанскай газеты з 15 жніўня па 12 верасня. Амаль месяц. Газета штодзённая. За гэты час змешчана дзесяць заметак, артыкулаў і пастаноў аб чыстцы. Для штодзённай газеты гэта не зусім многа, або, вярней, зусім няма многа. Але пакінем у баку колькасць. Нас галоўным чынам цікавіць якасць матэрыялу.

Возмем «Л. П.» за 29 жніўня. У гэтым нумары змешчана дзесяць заметак, артыкулаў і пастаноў аб чыстцы. Для штодзённай газеты гэта не зусім многа, або, вярней, зусім няма многа. Але пакінем у баку колькасць. Нас галоўным чынам цікавіць якасць матэрыялу.

Возмем «Л. П.» за 29 жніўня. У гэтым нумары змешчана карэспандэнцыя «Улічыць сур'ёзны палітычны ўрок ячэйкі Саюзтранса». У чым справа?

> «Камісія выявіла: група комуністаў, якія перараджаліся, зрасліся з класавым ворагам, на чале з сакратаром партыйнай ячэйкі Собалевым (у мінулым буйны арандатар) арганізавала змову супроць чысткі.
>
> 17 жніўня, за 3 дні да пачатка чысткі ячэйкі, СОБАЛЕЎ збіраў у кабінеце загадчыка стаповкі ІТР № 1 члена партыі ГАЛУЗА канспіраціўнае пасяджэнне з удзелам старшыні групкома Саюзтранса, члена партыі МАРЧЭЎСКАГА, шофара — кандыдата партыі БАЙДАКОВА і растратчыка БЕЛЕНА. На гэтым канспіраціўным пасяджэнні абгавор ваецца план зрыва чысткі, лінія паводзін, аб кругавой паруцы і дыскрэдытацыі нова-прызначанага дырэктара Саюзтранса тав. ЯНКОЎСКАГА, як чалавека, які небяспечан для іх.
>
> 18 і 19 жніўня гэта антыпартыйная групоўка перараджэнцаў і жулікаў зноў збіраецца на канспіраціўнае пасяджэнне, але ўжо на кватэры ў Марчэўскага».

Становішча, значыцца, вельмі сур'ёзнае. Трэба яшчэ дадаць, што бліжэйшыми прыяцелямі Собалева, Марчэўскага і іншых былі работнікі Саюзтранса: **Кісялёў** (былы ўрадзік), **Чэнцоў** (былы жандар), **Адзінцоў** і **Сяльноўсні** (шкоднікі).

Як ацэньвае становішча ў Саюзтрансе газета, якія яна робіць вывады? У тым-жа нумары ў перадавой «Больш класавай пільнасці» яна піша:

> «Справа ячэйкі Саюзтранса — гэта сур'ёзнейшы палітычны сігнал усёй партарганізацыі кожнай ячэйцы, комуністу. Ён сведчыць аб вялікай засмечанасці паасобных звенняў партарганізацыі аб поўным прытуплені класавай пільнасці ў паасобных ячэйках, аб наяўнасці агіднейшых фактаў заціска самакрытыкі, аб сямейнасці, групаўшчыне і кругавой паруцы».

Ні слова аб двух канспіраціўных сходах, скліканых сакратаром ячэйкі Собалевым для арганізацыі зрыва чысткі. Ні слова аб каронных гэтай змовы. Змова супроць чысткі ў Саюзтрансе, канспіраціўныя сходы былі там магчымы не толькі таму, што ў ячэйкі прытупілася класавая пільнасць, але і таму, што значная частка членаў ячэйкі перараджэлася, прыняўшы ў свае абдымкі былых жандараў, шкоднікаў і контр-рэволюцыянераў, проста ці ўскосна спрыяючы іх работе па разлажэнні ўсяго апарата Саюзтранса. Не арабіўшы палітычнай ацэнкі ўсяму, што адбылося ў Саюзтрансе, газета не здолела зрабіць і арганізацыйнага вывада аб неабходнасці паўторнай чысткі ячэйкі. Гэты вывад быў зроблен райкомам і райкамісіяй па чыстцы.

Ячэйка Саюзтранса была паўторна праверана. Аб паўторнай чыстцы ў «Л. П.» ад 12-IX была змешчана вялікая карэспандэнцыя, у якой падрабязна расказваецца, як і што адбывалася. Вельмі шмат фактаў, але няма даволі вострага палітычнага абагульнення, няма паказа на даным канкрэтным факце класавых і сацыяльных карэніў перараджэння.

У «Звяздзе» ад 13 жніўня мы паведамілі аб канспіраціўным сходзе супроць чысткі ў рабфаку Аршанскага чыгуначнага транспарта. Арганізатарам гэтага схода быў загадчык рабфака буржуазны перараджэнец **Шпак**. Мы спадзяваліся, што ў аршанскай газеце аб гэтым выключным факце ўдзела амаль усёй ячэйкі ў змове будуць некаторыя падрабязнасці. Аказалася, што ў газеце па гэтаму поваду ёсць толькі пастанова раённай камісіі па чыстцы. Ні перадавога, ні якогабудзь іншага артыкула, які-б растлумачваў партарганізацыі сутнасць гэтай справы, газета не здагадалася даць.

Матэрыял «Ленінскага прызыва» аб чыстцы не стаіць на выстарчальна-высокім палітычным узроўні. Чыстка ўскрыла вялікарнейшы недахопы ў аршанскай партыйнай арганізацыі, ускрыла факты перараджэння ў паасобных яе звеннях (хлебазавод, аддзяленне Белгандля, ЦРК, Саюзтранс, чыгуначны рабфак і г. д.). Гэтыя факты засталіся ў газеце толькі фактамі. Гэта памылка павінна быць выпраўлена. Усё, ускрытае чысткай, павінна знайсці ў газеце даволі глыбокае палітычнае асвятленне з тым, **каб на ўроках чысткі яшчэ больш мабілізаваць партыйную арганізацыю на барацьбу з класавымі ворагамі,** на барацьбу з апартунізмам і перараджэнцамі ўнутры партыі, на разгортванне большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі.

Нядаўна ў адной з перадавых аб чыстцы «Правда» пісала:

> «І сапраўды, чым, як не спабым разгортваннем самакрытыкі наогул, ігнараваннем чысткі, у прыватнасці, можна вытлумачыць факты ўзнікнення антыпартыйных змоў супроць чысткі? Дзе была да гэтага класавая чуласць кіраўнікоў раённых і навет абласных партыйных арганізацый? Чаму яны на такім узроўні трымалі ў масах рэволюцыйную пільнасць, што класавы вораг мог параўнаўча доўгі час беспакарана тварыць сваю агідную, подлую справу? Вось у чым асноўны палітычны ўрок усіх апошніх падзей і ў Донбасе, і ва Усходняй Сібіры, і ў некаторых іншых арганізацыях нашай партыі».

Задача газеты па матэрыялах аб чыстцы выхоўваць класавую чуласць партыйных арганізацый, проста і рашуча, па-большэвіцку даваць палітычныя ацэнкі таму ці іншаму факту, агаляць каронні апартунізма і перараджэння, смела і бязлітасна выкрываць вінаватых у заціску самакрытыкі.

Трэба цалкам і поўнасцю адмовіцца ад шаблёна, трафарэта, фіксатарства і бяззубасці. Трэба змагацца за высокую якасць і палітычную вострасць чысткі, за большэвіцкую самакрытыку па ёй. Гэтага патрабуе партыя ад нашага друка.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ ПЕРАДКАСТРЫЧНІЦКАЯ ВЫТВОРЧАЯ ПЕРАКЛІЧКА ПА РЭАЛІЗАЦЫ ПАСТАНОЎ ЛІПЕНЬСКАГА ПЛЕНУМА ЦК І ЦКК АБ РАБОЦЕ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

ПАДРЫХТОЎКУ ДА ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЛЁТУ ЎДАРНІКАЎ ЯКАСЦІ ЗРАБІЦЬ НЕАДЛУЧНАЙ ЧАСТКАЙ ПЕРАКЛІЧКІ

ЛІСТ ДЫРЭКТАРОЎ ГАРБАРНА-АБУТКОВЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ БССР

Прайшло амаль два месяцы пасля таго, як ліпенскі аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б даў рэзкую, глыбокую, справядлівую, большэвіцкую ацэнку нездавальняючай рабоце лёгкай прамысловасці Беларусі. Гэта ацэнка цалкам адпавядае рабоце гарбарна-абутковай прамысловасці. Мы працуем вельмі дрэнна.

Калі па асобных прадпрыемствах (завод «Большэвік», завод імя Сталіна) план па кольскасных паказальніках выконваецца, дык па якасных па адно прадпрыемства, уваходзячае ў сістэму нашага трэста, плана не выканала.

Падамо лічбы.

На нашай дрэннай рабоце краіна страціла толькі за першае паўгоддзе 490 тысяч рублёў з-за невыканання плана па сабекошту. Прадукцыйнасць працы дасягнула толькі 98,2 проц. супроць плана, а па абутковых фабрыках — 91,7 проц. Замест 10-процентнага адхілення ад перапага гатунка, мы выпусцілі 81 проц. негатункового абутку.

Ці можам мы ківаць на тое, што ўмовы нашай работы быцнам-бы горшыя ў 1933 годзе, чым у 1932? Не. Ці можам мы спасылацца на адсутнасць сырцу? Ні ў якім выпадку! План наш складзен на падставе зусім рэальных сырцовых магчымасцей.

Дрэнную работу мы можам аднесці цалкам і поўнасцю за свой рахунак. Хіба-ж неверна, што мы не выкарысталі ўсіх магчымасцей, якія партыя і ўрад далі нам у галіне ўкацавання адзінаачання, правядзення гаспадарчага разрахунку?

Ці-ж не праўда, што пастанова менскай партыйнай канферэнцыі па якасці нами не выконвецца, што мы за якасць не змагаемся з усёй рашучасцю большэвіка-дырэктара?

Мы павінны прызнаць, што часта, вельмі часта мы гаворым аб пасці ўмовах тав. Сталіна, але мы яшчэ мала зрабілі ў галіне ліквідацыі абазлічкі, ураўнілаўкі, змяшэння цікучасці рабочай сілы і ўмацавання гаспадарчага кіраўніцтва.

Нарэшце, мы зусім невыстарчальна скарысталі такі магутны вагар, як соцыялістычнае спаборніцтва. Мы павінны прызнаць, што некаторыя в нас замест таго, каб яшчэ шырэй разгарнуць спаборніцтва рабочых і ІТР, дапусцілі ў рады ўдарнікаў бракаробаў, парушальнікаў працоўнай дысцыпліны. Давайце скажам проста: гаспадарча-разрахунковыя брыгады пагоршылі сваю работу з прычыны слабай нашай увагі да гэтага пытання.

Працоўная дысцыпліна на нашых фабрыках настаўлена дрэнна, індывідуальнага ўліку выпрацоўкі ў нас яшчэ няма, гэта не дае магчымасці змагацца з сапраўднымі бракаробамі. Хіба-ж гэта ня наша віна?

Возмем такое балючае пытанне нашай вытворчай практыкі — прастоі. Мы часам спасылаемся на прастоі з-за дрэннага снабжэння, несвячасовай падачы матэрыялаў, некамплектнасці і г. д. Часткова гэта так. Але вялікую долю віны мы павінны ўзяць на сябе, па кіраўнікоў прадпрыемстваў. Мы часта парушаем фінансавую дысцыпліну. Мы ня можам расплачвацца за сырэц са снабжэнцамі толькі таму, што мы «з'елі» свае зваротныя сродкі.

Мы гаворым аб усіх гэтых недахопах у нашай рабоце не для таго, каб лішні раз толькі прыкмаць свае памылкі. Не ў гэтым справа. Не гэта выцягне нас з балота — прарыва. Ад нас ад дырэктара і тэхнарука прадпрыемства партыя і ўрад патрабуюць выканання планаў і ад нас у значнай ступені залежыць іх выкананне. Наш ліст накіраван на тое, каб адначасова з прызнаннем гэтых памылак, выправіць іх рашуча, па-большэвіцку.

Рабочыя і ІТР віцебскай ільнапрадзільнай фабрыкі «ДЗВІНА» звярнуліся да ўсіх прадпрыемстваў БССР з прапановай аб арганізацыі перадкастрычніцкай перакліччы. Мы поўнасцю ўхваляем гэту прапанову і сапраўды па-дзелавому ўключаемся ў перакліччу. На нашых прадпрыемствах зараз праводзіцца вялікая работа па падрыхтоўцы да ўсебеларускага злёта ўдарнікаў якасці. Мы лічым, што гэта работа павінна быць падначалена задачам перакліччы, стаць неад'емлемай не часткай. Мы бярэм на сябе такія абавязацельствы:

1. Поўнасцю на кожным прадпрыемстве выканаць план першага году другой пяцігодкі.

2. Пераглядзець штаты і наяўнасць рабочай сілы, каб поўнасцю ўкамплектаваць прадпрыемствы, або вызваліць іх ад скрытых лішкаў рабочай сілы.

3. Увесці ў напывачных цэхах абутковых фабрык Віцебску і Гомеля сістэму гаспадарчай здзельшчыны для ІТР. Напыўшыць гаспадарчую здзельшчыну на ІТР закройнага і штампавачнага цэхаў менскай абутковай фабрыкі.

4. Пераглядзець правілы ўнутранага распарадка ў бок умацавання працоўнай дысцыпліны, ушчыльнення рабочага дня і стварэння культурнай абстаноўкі для работы ў цэхах і на прадпрыемствах.

5. У межах адпушчанага фонда зарплаты павысіць зарплату ІТР, працуючым непасрэдна ў цэхах.

6. Змяніць графік работ рамонтных цэхаў такім чынам, каб забяспечыць змяшэнне прастояў па рамонту варштатаў. Увесці штодзённы агляд машын і варштатаў малярамі. Спабдзіць рабочых змазачнымі матэрыямі і інструментам, неабходным для бягучага рамонта машын. Увесці ў практыку перадачу змена-журнальных запісаў пры зменах.

7. Ні ў якім выпадку не запускаць у вытворчасць матэрыялаў, фарбітуры і хэмікатаў, якія не прайшлі папярэдняга выпрабавання.

8. Да 1 кастрычніка ўвесці на ўсіх прадпрыемствах індывідуальны ўлік

МІЖНАРОДНАЯ СЛЕДЧАЯ КАМІСІЯ ВЫКРЫВАЕ САПРАЎДНЫХ ПАДПАЛЬШЧЫКАЎ РЭЙХСТАГА

У Лондане абмяркоўка наслядкаў міжнароднай следчай камісіі крыстаў грамадзкі суд) па пытанні аб падпале германскага парламента.

Камісія заслухала паказанні свядкоў найбольш соц. дэмакратаў Германіі БРЭЙТШЭЙДА (прэзідыр германскіх соц. дэмакратаў), ГРЖЭЗІНСКАГА (былы начальнік берлінскай паліцыі, міні. пр унутраных спраў Прусіі) і Герца (былы старшыня соц. дэмакратычнай фракцыі германскага парламента).

УСЕ ЯНЫ АДМАЎЛЯЛІ, ШТО ПАРЛАМАНТ БЫЎ ПАДПАЛЕН КОМУНІСТАМІ. Напрыклад, Грженінскі заявіў, што пасля пажару парламента было арыштавана 1.500 комуністаў за два дні, прычым на іх арыштаваных меліся фотаздымкі і сведкі на права арышта. Гэта заява Грженінскага паказвае, што ПАХОД СУПРОЦЬ КОМПАРТЫІ БЫЎ ПАДРЫХТОВАН ЯШЧЭ ДА ПАДПАЛА.

Брэйтшэйд адмаўляў магчымасць падпала парламента комуністамі. Горц адкрыта прызнаўся, што соцыял-дэмакраты, дазваляючы сваю недачыннасць да падпала, не выявілі сваіх адносін да абвінавачванняў, высунутых фашыстамі супроць компартыі.

На пасяджэнне камісіі прыбыў пакаранны фашысцкім уралам абаронца комуніста Торглера Зак. Асобным членам комісіі Зак даў зразумець, што калі камісія ўстрымаецца ад выкрыцця фашыстаў, то Торглер будзе апраўдан. Не гат ангельскі буржуазны друк піша, што гэта заява—проста хітрасць фашыстаў з мэтай мець уплыў на высновы камісіі. Германскі пасол у Лондане прабаваў дабіцца ад ангельскага ўрада забароны гэтага грамадзкага суда, але не меў поспеху.

ФАШЫСТ, ПРАВАКАТАР, ДЭГЕНЕРАТ

САПРАЎДНЫ ТВАР ВАН ДЭР-ЛЮБЕ

ЛОНДАН, 16. (БЕЛТА).

Грамадскі суд перайшоў да выяснення асобы Ван дэр-Любе. Старшыня Прыт указаў, што члены міжнароднай следчай камісіі наведалі ў свой час Галандыю і апытвалі 16 сведак. Затым сакратар агласіў змест іх паказанняў.

З гэтых паказанняў відаць, што Ван дэр-Любэ—фашыст, вышаў з компартыі ў красавіку 1933 года і, калі быў у компартыі, праяўляў сябе як вельмі недысцыплінаваны, адмаўляўся ад работы і г. д. Згодна паказаллям, Ван дэр-Любэ—тыповы псіхапат, гомасексуаліст якога толькі адна з праяў яго паталагічнага стану. У яго такі дрэнны почерк, што чытаць ён можа толькі на адлегласці 5-6 сантыметраў, што выключае магчымасць самастойнай падрыхтоўкі і самастойнага выканання падпала рэйхстага. Гаспадыня дома, дзе ён жыў, сваліла лісты, якія сведчылі аб тым, хто быў яго германскія знаёмыя, якім ён часта перадаваў таемныя візіты.

Усе ўказаныя факты пацвярджаюць рад сведак, якія выступаюць перад грамадзкім судом. Страхавы агент Плазмейер з Лейдэна апісаў, як на фашысцкім мітынгу ў кастрычніку 1932 года, калі рабочыя не давалі гаварыць фашысцкаму аратару, Ван дэр-Любе заклікаў іх выслухаць апошняга. Варочаючыся з гэтага мітынга, Ван дэр-Любе хвалёўся гаварыў, што аўдыторыя не разумее, што такое фашызм і што «ў фашызме шмат прыгожасці».

Другі сведка, гаагскі рабочы Варолтэн, паказае, што ў кастрычніку 1932 года ў Гаазе ён сядзеў побач з Ван дэр-Любе на мітынгу бастуючых шафераў таксі. Ён пачаў размаўляць з Ван дэр-Любе, але таварыш папярэдзіў яго, што з апошнім трэба быць асцярожным, бо ён — фашыст; гэта ясна выявілася паводле слоў сведкі, калі ў часе гэтага мітынга Ван дэр-Любе заявіў яму, што ён праціўнік усіх форм кіраўніцтва забастоўкай. Як указаў далей сведка, стваралася ўражанне, што ён наогул праціўнік прафсаюзаў.

Затым агалашаюцца заявы брата і нявесткі Ван дэр-Любе, якія ў прысутнасці паліцыі паведамілі прыбыўшаму ў Галандыю нацыянал-соцыялістскаму паліцэйскаму камісару, што Ван дэр-Любе не быў членам компартыі ўжо на працягу 2-х год.

У канцы пасяджэння былі заслуханы паказанні Ван-Лейвена, які прадставіўся аўдыторыі як літаратар-мастак. Ван Лейвен — характэрная фігура для кола гомасексуалістаў, з якім быў звязан Ван дэр-Любе. Адзін з членаў суда запытаў у сведкі: «Ці памятаеце вы паказанні, якія вы мне далі пры папярэднім расследаванні справы ў Галандыі? Ці гатовы вы паўтарыць іх публічна тут? Помніце, што ад гэтага можа залежыць жыццё людзей».

Сведка пасля некаторага хістання згадзіўся.

Спачатку ён паўтарыў увогуле паказанні іншых сведак. Ён ведаў добра Ван дэр-Любе ў перыяд 1927—31 г. г., жыў з ім у адным доме. Ён указаў, што ведаў яго, як члена компартыі да 1931 г. і як праціўніка гэтай партыі пасля, але што палітычныя погляды Ван дэр-Любе заўсёды адзначаліся крайняй неакрэсленасцю. Смех аўдыторыі выклікалі словы сведкі, што Ван дэр-Любе быў «параўнаўча сумленным чалавекам».

Як і іншыя сведкі, Ван-Лейвен паказаў, што Ван дэр-Любе жыў на пенсію па інваліднасці, што адзнак на перашкаджала яму сядзець у Германію, дзе «багатыя людзі рабілі з ім доўгія паездкі ў аўтамабілях». Сведка расказаў далей, што паводле слоў гаспадыні дома, яна звярнула адночы ўвагу Ван дэр-Любе на тое, што тэрмін яго пашпарта выходзіць 15 сакавіка 1933 года. На гэта ён адказаў, што яму гэты пашпарт будзе не патрэбен і намякнуў на тое, што ў Германіі павінны адбыцца буйныя падзеі. Гаспадыня гаварыла таксама, што Ван дэр-Любе рабіў паездкі ў Германіі, калі асабліва меў патрэбу ў грошах. У заключэнне сведка падкрэсліў, што Ван дэр-Любе «любіў, каб аб ім гаварылі», і лёгка паддаваўся чужым уплывам.

НАВАТ ЯНЫ ПРЫЗНАЮЦЬ ВІНОЎНАСЦЬ НАЦЫЯНАЛ-СОЦЫЯЛІСТАЎ

Н'Ю-ІОРК, 15 (БЕЛТА).

Нават найбольш рэакцыйныя газеты ўказваюць на віноўнасць нацыянал-соцыялістаў у падпале рэйхстага. «Мільёны людзей пераконаны — піша «Н'ю-Іорк Івнінг пост», — што рэйхстаг быў падпален нацыянал-соцыялістамі, якія стараюцца перакласці віну на сваіх ворагаў».

ЛОНДАН, 16. (БЕЛТА).

На сённяшнім пасяджэнні міжнароднага грамадзкага суда даваў паказанні пераны з сведак, імя якога не агалашаецца.

Сведка — журналіст, які працаваў у Берліне 5 год да пажара рэйхстага — паведаміў яркія факты аб адносінах паміж Ван дэр-Любе і відным нацыянал-соцыялістам Рэмам на працягу некалькіх год да пажара. Сведка ведаў забітага нацыянал-соцыялістамі Белла, увайшоўшы з ім у кантакт у перыяд, калі Белл быў падсудным на працэсе падробшчыкаў чырвонцаў у 1930 годзе.

У 1932 годзе Белл расказаў сведку, што ён цесна звязан з лідэрам штурмавікоў Рэмам. Каб паказаць сваю цесную сувязь з Рэмам, Белл перадаў сведку спіс 20-30 мужчынскіх імёнчыя. Сярод іх увагу сведкі звярнула, паводле яго слоў, імя Марынус Ван дэр... Далей разабраць было немагчыма. Пасля гэтага імя стаяла ў скобках — Галандыя. Белл сказаў яму, што гэта — «любімчык» Рэма і што гэты спіс з'яўляецца сродкам абароны Белла супроць нацыянал-соцыялістскіх лідэраў.

На пытанне члена суда Маро Джаферы, ці можа ён даць чэсные слова, што ён бачыў гэта імя ў спісе, сведка адказаў: «так».

— З'явіўшыся сюды, я надзеяўся выявіць небяспецы не толькі сябе, але і сваю сям'ю, якая знаходзіцца яшчэ ў Германіі. Калі я з'явіўся сюды, дык толькі для таго, каб сказаць усю праўду і толькі праўду.

Затым сведка падвергся скрыжаванаму допыту, у часе якога ён пацвердзіў з усёй абавязасцю ўказаныя вышэй факты. Член суда Гарфільд Гейс запытаў сведку, ці помніць ён, хто былі абаронцы Белла на працэсе падробшчыкаў чырвонцаў. Сведка адказаў, што ён ведае, але лічыць за лепшае не гаварыць. Затым Гейс запытаўся: «Ці не быў адным з абаронцаў доктар Зак? — Так — адказаў сведка. На пытанне ці не з'яўляецца Зак зараз афіцыяльным абаронцам Торглера, сведка зноў даў станоўчы адказ.

„ЛОНДАНСКІ ПРАЦЭС— СМЯРОТНЫ УДАР ПА АБВІНАВАЎЧАМУ АКТУ“ ВОДГУКІ ПОЛЬСКАЙ ПРЭСЫ

ВАРШАВА, 16. (БЕЛТА).

Газеты публікуюць падрабязныя справаздачы аб ходзе Лонданскага працэса. Сенсацыйныя паказанні Гржэзінскага, Бернгарта і Брэйтшэйда друк дае з загалоўкамі: «Нацыянал-соцыялістскія падпалышчыкі перад судом цывілізаванага света», «Лонданскі працэс з'яўляецца смяротным ударам па абвінаваўчаму акту», «Небывалая ў гісторыі чалавецтва правакацыя» і г. д.

АРЫШТЫ, АБЛАВЫ, ПРАВАКАЦЫІ

БЕРЛІН, 16. (БЕЛТА).

Начальнік лейпцыгскай паліцыі паведамляе аб арышце 8 чалавек, якія нібыта займаліся пашырэннем антыўрадавых адозваў з повазу маючага быць працэса аб падпале рэйхстага. Паводле слоў паведамлення, арыштаваныя з'яўляюцца членамі «нелегальнай вакенай арганізацыі, у якую уваходзілі былыя члены саюза чырвоных франтавікоў».

У Брэмене арыштавана некалькі будаўнікоў, якія на адным з плянцоў на вачах у публікі сарвалі вывешаны там нацыянал-соцыялістскі сцяг.

Як паведамляе «Дортмундэр генераль анцэйгер», у Мерсе праведзена аблава ў рабочым раёне. Знойдзена нібыта шмат комуністычнай літаратуры, а таксама зброі. Арыштавана 23 чал., якія зараз-жа былі зняволены ў канцлагер. Дортмундскі начальнік паліцыі заклікае насельніцтва памагчы паліцыі ў барацьбе супроць комуністаў, якія «не спыняюць папыраць лістоўкі антыцярыкальнага зместа». У яго адозве ўказваецца, што толькі ў радкіх выпадках паліцыі ўдавалася арыштоўваць папыральнікаў лістовак.

У Гагене на працэсе 28 комуністычных рабочых, якія абвінавачваліся ва ўдзеле ў сутычцы з нацыянал-соцыялістамі, пракурор патрабаваў кары смерцю для чатырох абвінавачаных, а для астатніх шматгадовых катаржных работ.

„АБАРОНЦА“, ВАРТЫ ФАШЫСЦКІХ ПРАКУРОРАЎ

ЛОНДАН, 16. (Белта). Назначаны Лейпцыгскім судом афіцыяльны абаронца Торглера Зак пакінуў Лондан. Учора ў прысутнасці некалькіх журналістаў, ён заявіў члену міжнароднай следчай камісіі Брантынгу, што прыбыў у Лондан азнаёміцца з матэрыялам, карысным для абароны Торглера. Брантынг адказаў яму, што цэлы дзень пасяджэння грамадзкага суда будзе прысвечан Торглеру. Тым не менш, як высветлілася, Зак сёння раніцою выехаў у Берлін.

КУБА

Ў АГНІ РЭВОЛЮЦЫЙНАГА РУХУ

Н'Ю-ЮРК, 15.

Колькасць бастуючых на Кубе дасягае 150.000. Рабочыя, захапіўшыя цукровыя заводы, абменьваюць цукар на іншыя прадметы харчавання. У Сант-Яго рабочыя зняслі мясцовага мера і замянілі яго сваім чалавекам. Урад імкнецца ўсыпіць пільнасць рабочых, абяцаючы прыняць прафсаюзы і палепшыць умовы працы.

У той-жа час узмацняецца тэрор. У Гаване забіт правадыр саюза грузчыкаў. У радзе гарадоў рэакцыйныя афіцэры арганізуюць бойкі, але ўсякі раз сустракаюць рашучы адпор з боку рабочых. Урад апублікаваў дэкрэт, абвяшчаючы часовую дыктатуру. Дэкрэт яўна абяцае жадаўне ўрада шляхам дэмагагічных абяцанняў забяспечыць слабе ад пагрозы роста антыімперыялістычных настрояў мас і ў той-жа час замацаваць за сабой падтрыманне амерыканскага капітала. Так, дэкрэт абяцае «захаваць поўнасцю нацыянальную незалежнасць», але ў той-жа час змяшчае абавязацельства «паважаць і захоўваць існуючыя дагаворы, у тым ліку, відавочна, фінансавыя абавязацельствы ў адносінах да ПАЗШ, славутую папраўку Платта, якая замацоўвае за Вашынгтонам права на інтэрвенцыю супроць Кубы, захаванне амерыканскай ваенна-марской базы ў Гуантанамо і г. д. Для поўнага супакаення амерыканскіх цукразаводчыкаў і плантатараў указваецца, што ўся незаконна экспрапрыяваная ўласнасць будзе вернута ўласнікам.

***

На востраве Куба забастовачны рух узмацняецца. Рабочыя захапілі ў свае рукі звыш 20 цукровых заводаў (са 180 на востраве) і патрабуюць ад амерыканскіх прадпрыемцаў павышэння зарплаты. Новы ўрад, які складаецца з прадстаўнікоў кубінскай буржуазіі, баючыся растучага рэвалюцыянізавання салдат, рабочых і сялян, узбройвае і праводзіць абучэнне некалькіх тысяч студэнтаў.

МІЖНАРОДНЫ АНТЫВАЕННЫ КАНГРЭС МОЛАДЗІ

ПАРЫЖ, 15 (БЕЛТА). Як паведамляе «Юманітэ», сусветны кангрэс моладзі супроць вайны і фашызма адбудзецца ў Парыжы 22-24 верасня. Парадак дня: 1) даклад Анры Барбюса на тэму «становішча моладзі ў капіталістычных і каланіяльных краінах і барацьба супроць імперыялістычнай вайны і фашызма»; 2) даклад совецкай делегацыі аб становішчы моладзі ў СССР, яе ўдзеле ў соцыялістычным будаўніцтве. Мірная палітыка Совецкага саюза; 3) інфармацыя аб Лейпцыгскім працэсе і аб контр-працэсе ў Лондане; 4) абмеркаванне маніфеста сусветнага кангрэса да моладзі ўсіх краін; 5) выбары міжнароднага моладзьнага камітэта барацьбы супроць імперыялістычнай вайны і фашызма.

МАКС ГЕЛЬЦ

ГОРКІ, 16 (БЕЛТА). У часе прагулкі ў лодцы па р. Оцэ, вышэй Канавінскага маста, у горадзе Горкім, увечары, 15 верасня, затануў вядомы германскі комуніст тав. **МАКС ГЕЛЬЦ.** Пахаванне тав. Макса Гельца адбылося ў Горкім 17-га верасня.

ПАМЯЦІ МУЖНАГА РЭВОЛЮЦЫЯНЕРА МАКСА ГЕЛЬЦА

Макс Гельц радзіўся ў 1889 годзе ў Морыцы, каля Рызы (Саксонія), у сям'і рабочага лесапільнага завода. Пры сканчэнні сусветнай вайны Макс Гельц быў членам незалежнай с-д. партыі ў Фохтландзе (Саксонія).

У хуткім часе пасля стварэння комуністычнай партыі ён уступіў у яе рады і арганізаваў актыўную барацьбу за інтарэсы беспрацоўных. У разультаце паследваў напад рэйхсвера і назначэнне ўзнагароды за галаву Макса Гельца, якому прыйшлося скрывацца. У 1920 годзе Макс Гельц стаў на чале фохтландскіх рабочых у іх барацьбе супроць рэакцыі. У 1921 годзе ён быў арыштован і прысуджан да пажыццёвай катаргі. 7 год ён прасядзеў за сценамі катаржнай турмы. У 1928 годзе ён быў вызвален. Але яго здароўе было падарвана і па прапанове ЦК германскай компартыі ён пер[illegible] ў СССР.

Падарунак эскадрыллю імя Кагановіча

Асвейскі, Ушацкі, Камарынскі, Лельчыцкі, Парыцкі, Тураўскі, Чачэрскі і Чырвонапольскі раёны не ўнеслі ні капейкі на эскадрыллю. Ці думае кіраўніцтва ўзначаліць ініціятыву мас

Паступленне сродкаў на пабудову эскадрыллі імя тав. Кагановіча ў апошнія дні значна аслабла. Асвейскі, Ушацкі, Камарынскі, Лельчыцкі, Парыцкі, Тураўскі, Чачэрскі і Чырвонапольскі раёны ўсё яшчэ не ўнеслі ні адной капейкі. Аслабла работа і ў іншых раёнах. Гэта ў той час, калі сабрана толькі палова сродкаў. Раённыя арганізацыі недаацанілі важнасці кампаніі, не разгарнулі масавапалітычнай работы сярод працоўных. У выніку гэтага рад раёнаў перавялі зусім мізерныя сумы, нічога не робячы, каб поўнасцю выканаць свой абавязак перад краінай. Так, **Чашніцкі** раён сабраў усяго 91 руб., **Уваравіцкі** — 116 руб., **Чавускі** — 141 руб., **Лоеўскі** — 200 руб., **Прапойскі** — 285 руб., **Суражскі** — 362 руб., **Клічаўскі** — 469 руб., **Талачынскі** — 483 руб., **Расонскі**—590 руб., **Шклоўскі** — 591 руб., **Стара-Дарожскі** — 570 руб. і інш. Сабраўшы гэтыя незначныя сродкі, памянёныя раёны спынілі збор сродкаў. Зусім адсутнічае масавая работа ў вёсцы. У многіх раёнах сяляне не ведаюць, што праходзіць такі збор. Соцспаборніцтва вакол кампаніі не разгорнута. Раённыя газеты стаяць у баку ад гэтай важнай кампаніі. У Тураўскім раёне, які яшчэ не даў ні капейкі на эскадрыллю, раённая газета «Калгаснік Тураўшчыны» ні слова па гэтым пытанні не пісала. Тое-ж самае назіраецца і ў газетах Чачэрскага, Ушацкага, Чырвонапольскага і іншых раёнаў.

Раённым арганізацыям патрэбна нарэшце, узяць на сябе кіраўніцтва кампаніяй, а не спадзявацца на самацёк.

Райгазеты павінны аператыўна штодзённа асвятляць ход сродкаў, разгарнуўшы соцспаборніцтва на лепшае правядзенне кампаніі.

„Комунар Магілеўшчыны“ маўчыць

Магілеўскі раён за ўвесь час сабраў на пабудову эскадрыльі імя т. Кагановіча 14.901 руб. Лічба ганебна нізкая. У чым справа? Чаму такія тэмпы збору сродкаў? Прычыны ў тым, што раённыя арганізацыі і раённы друк недаацанілі ўсёй важнасці кампаніі. Іх нават не турбуе тое, што Віцебскі раён, з якім спаборнічае Магілеўскі, даўно апярэдзіў іх, сабраўшы 138.822 руб.

Зусім ясна, што роля газеты ў мабілізацыі і арганізацыі мас на збор сродкаў у фонд пабудовы эскадрыльі выключна важная. Як-жа «Комунар Магілеўшчыны» ўзначаліў ініцыятыву мас па выкананні свайго гаварованага абавязка.

Для кожнага свядомага рабочага і калгасніка ясна, што ўзнятая па прапанове гомельскіх перадавых ударнікаў заводаў і калгасных палёў кампанія збору сродкаў на пабудову эскадрыльі ёсць выключна важная палітычная кампанія, якая ўзмацняе наш чырвоны паветраны флот, нашу соцыялістычную народную гаспадарку, нашу абароназдольнасць. На жаль, гэтага, як відаць, не зразумелі ў рэдакцыі «Комунара Магілеўшчыны». Інакш, чым выпумачыць тое, што газета фактычна выцесніла са сваіх старонак пытанне аб пабудове эскадрыльі. Інакш, чым выпумачыць, што на працягу жніўня і верасня «К.М.» выступіў усяго разоў 5 і то неваўлічніі хранікёрскімі заметкамі на задворках газеты.

Ці так вядуць палітычную кампанію, якая спаткана з вялікай ухвалай шырокімі масамі рабочых і калгаснікаў? Дзе палітычная завостранасць, дзе панаж перадавых і адстаючых, дзе большэвіцкая мабілізацыя мас на свячасовае выкананне свайго абавязка перад краінай?

Гэтага няма. Газета ў гэтым пытанні паказала сябе нездольнай ацаніць важнейшую палітычную справу. Яна стала ў ролі пасіўнага назіральніка, у ролі глухога, які не здолен пачуць голаса працоўных. Рэдакцыя не зразумела загаду, што адзнакі індывідуальнымі выклікамі справу не зрушыш, што патрэбна ўцягнуць у кампанію шырокія працоўныя масы рабочых і калгаснікаў, а для гэтага трэба папулярызаваць задачы і значэнне пабудовы эскадрыльі. Выпразіць гэтае раўнадушша, арганізаваць ініцыятыву мас — бачны абавязак газеты. У гэтым, мы не сумняваемся, ёй дапаможа РК КП(б)Б.

УНОСЯЦЬ І ВЫКЛІКАЮЦЬ

Т. т. КАРТУКОЎ і ПЫЖЫКАЎ адказваюць на выклік т. ГАЛАДЗЕДА, уносяць па 50 руб. на пабудову эскадрыльі імя т. Кагановіча і выклікаюць: РОЗІНА, ГУРЭВІЧА, ГЕРЦОВІЧА, КАМАРОВА, ЗЛОТКІНА, ЛЫЧОВА, ТАМАРКІНА, ПЕСЭ ДЗЯНІСКЕВІЧА і ВІЛЬЧЫКА.

На бягучым рахунку 808.628 руб.

За 15 верасня па бягучы рахунак № 160-7814 паступіла 19.564 руб. Ад Менскага р.—16 школы — 19 руб., Каладзішчанскай радыё-станцыі — 21 руб., групкома скурнікаў — 72 руб., Апчацкага сельсовета — 112 руб., ад Астрашыцка-Гарадзецкага сельсовета — 198 руб. З раёнаў: **Любаньскага** — 3.031 руб., **Гарадоцкага** — 2.468 руб., **Чэрыкаўскага** — 1.247 руб., **Б.-Кашалёўскага** — 520 руб., **Сіроцінскага** — 1.316 руб., **Асіпавіцкага** — 1.272 руб., **Рэчыцкага**—600 руб., **Стара-Дароскага** — 536 руб., **Сенненскага** — 644 руб., **Пухавіцкага** — 1.406 руб., **Кармянскага**—1.114 руб., **Жыткавіцкага** — 292 руб., **Дубровенскага** — 997 руб., **Дрысенскага** — 1.442 руб. і **Заслаўскага** — 864 руб.

За 16 верасня паступіла: ад арганізацый і ўстаноў гор. **Менска** — 696 рублёў. З раёнаў: **Рэчыцкага** — 200 руб., **Дубровенскага** — 492 руб., **Лёзненскага** — 429 руб., **Мсціслаўскага** — 105 руб. і **Магілёўскага** — 47 руб. Усяго за дзень паступіла **1.970 руб.**

За 17 верасня паступіла ад гаракасы 47 руб., ад Менгаркома «Чырвонага Крыжа» 732 руб., ад ЦКК-НК РСІ БССР — 332 руб., ад Бел. адз. УЭА — 105 руб. З раёнаў: **Крупскага** — 1.355 руб. і **Чавускага** — 58 руб. Усяго за дзень паступіла **2.630 руб.**

З пачатка збору на бягучым рахунку 808.628 руб.

ПАВЕДАМЛЕННІ

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б выклікае на 20 верасня г. г., у 11 гадз. ран. у г. Менск (Савецкая, 55, памяшк. ЦКК-РСІ Бел.) для разгляду апеляцый наступных т. т.:

КІРЫКАВА А. Т., ЗАБЕЖЫНСКАГА М. А. (школа міліцыі, Менск); БАСАЛЫГА Я. М. (Копыль); КОРАКА Л. Ф., ЛАГУН П. Н. (ВКСГШБ); БОНДАРА Г.П. (Дзяржплан); ГЕЛЕРА І. К., ПАДОЛЬСКУЮ А. Ф., БУРШТЭЙНА А. М., АДЛЕРШТЭЙН К. І. (фабрыка «Кастрычнік», Менск); ЭЙДЭЛЬМАНА Я. А., КІЙКО Х. Я., ПОТАША А. М., УЗЕЛЕУСКУЮ Е. А., НАГІБО Е. А., ЦАРУК М. А. (Гістпарт); МАТУСЕВІЧА І. М. (камітэт радыёвяшчання).

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ.

Камісія па чыстцы партканклетыва Наркамасветы паведамляе, што 19-га верасня 1933 года, роўна а 6-й гадзіне ўвечары пачнецца чыстка Парткалектыва Наркамасветы.

Чыстка адбудзецца ў памяшканні польскага тэатра (Совецкая вуліца).

Просьба да ўсіх работнікаў культасветных устаноў і рабочых прыйсці актыўны ўдзел у чыстцы.

Камісія просіць увесь матэрыял аб рабоце Наркамасветы прысылаць па адрасе: Менск, Гаркамісія па чыстцы (вуліца Карла-Маркса—14, Правяркому Наркамасветы).

ЯЧЭЙКОВАЯ КАМІСІЯ.

ПК ЦКК КП(б)Б просіць т. т. Фігіпушка А., Кроліка Я., Лабейка М., Сіўцова М. Ф. з'явіцца ў ПК ЦКК КП(б)Б

Просьба да ўсіх партарганізацый, ведаючых аб месцы знаходжання паказаных таварышоў паведаміць аб гэтым ПК ЦКК.

Аддзел кадраў ЦК КП(б)Б прапануе ніжэйпаказанным т. т., залічаным у выпускную комуністычную с.-г. школу, неадкладна з'явіцца на заняткі.

Куноўскі А. Я. (Аршанскі раён); Серкаў З. І., Гапвас В. В. (Асіпавіцкі); Дзеравянскі С. Ц. (Бабруйск); Дварэцкі С.М. (Бярэзінскі раён); Гардзейчык Ф. М. (Быхаўскі); Давыдоўскі У. І. (Варыса́ўскі); Лібман Л. П., Магілжава Р. І., Штабны Ц. Я. (Віцебск); Крушкачоў С. Я., Нікананаў А. Б. (Веткаўскі); Шур Н. Я., Гупакоў К. Е., Чавускі І. Г., Паўляноў Д. І., Атрошчанка Ф. І., Тарадзей А. Н. (Гомель); Данілаў А. А. (Горкі); Баранава Н. Б. (Дуброўна); Рагазенка П. М., Шэўчанка Ц. К. (Ельскі); Пагодзін Н. Х. (Жлобін); Доўбня Я. Е., Кешка П. М. (Клічаў); Кудзін М. І., Бардоўскі І. Е. (Касцюковічы); Шуб М. І. (Крупскі раён); Кулача В. А., Хадзевіч В. Л., Юр'яў Я. Р., Пінчук К. Д., Юраў У. М., Тарасенка Х. П. (Лоеўскі раён). Кунліцкі В. Л. (Любань), Русак В. Ц. (Лельчыцы), Кабанаў А. П. (Мсціслаўе), Эркін З. Я., Левін М. А., Авіжыц І. І., Іваноў У. М., Ефімаў І. Я., Шацкі М. А. (Менск); Ерамеяў М. Б., Корбат Н. А., Фролаў П. В. (Магілеў); Камісарчык Б. І., Лонічка Ф. Я. (Мазыр); Кротаў Е. Н. (Пружаны); Зротнік П. М. (Пятрыкоў); Сідарэнка М. Р. (Рагачоў); Федаровіч Я. Ц., Цінзбург З. А., Шатон К. В., Папей М. Г. (Рэчыца); Крэшчаноўч І. П. (Смалявічы); Падаруўскі, Лепяшынскі І. Л., Пуцейка (Слонім); Мельнікова М. І. (Старобін); Раменькова М. А. (Талачын), Краўчанка Г. М., Бафанаў Ц. А. (Уваравічы); Кулакоўскі К. А., Рудчанка А. С., Кулакоўскі Я. А. (Хойнікі); Анупіс П. А., Мандрык (Чашнікі); Сінаўскі С. Ц. (Чырвонапольск); Нехай А. М., Кац М. Р. (Чэрвеньск); Мікалуцкі С. І. (Шклоўскі раён).

Аддзел кадраў ЦК КП(б)Б.

Аддзел кадраў ЦК КП(б)Б прапануе ніжэйпаказаным таварышам неадкладна з'явіцца на іспыты для паступлення ў вышэйшую комуністычную сельска-гас[illegible] школу:

ПАХОМЕНКА П. Я. (Аршанскі раён); КУНІЦКІ А. І. (Асвейскі); ЛІУШЫЦ І. С., СТАРАВОЙТАЎ Г. П. (Бабруйскі); КАЗЛОЎ (Бялыніцкі); КНЯЗЕЎ Д. Я., ІСАДЧАНКА Н. В. (Быхаўскі); КРЫВАРОТ С. Ц., КУЛЯНОК Н. К. (Барэзінскі); АРЦЁМЕНКА А. В. (Веткаўскі); КРАСІНСКІ А. А. (Ушачы); ТАМКОЎ Л. Н., ШЫШКІН І. І., ЗГІБНЯЎ П. Я. (Жлобінскі); ГРЭКАЎ Л. Т. (Горкі); МАРОЗАВА В. М. (Крупскі); ПРЫМА М. Е. (Ч. Слабада); МІНЧАНКА А. М. (Лепельцы); ПЕТРАКОЎСКІ В. П., ЛЕГАН С. І. (Лагойскі); ЗАЙКІН (Мсціслаўе); ХОМІЧ А. П., ЯГУДЗІН Ш. І. (Магілеўскі); ЛІВЕРТАЎ І. С. (Парыцкі); ТОЎСТЫ У. Я., ЯРЛОВІЧ І. Ф. (Плешчаніцкі); САПУН Х. Я. (Пухавіцкі); ЮШКЕВІЧ А. Ю. (Смалявіцкі); СКУЦЭНЯ Х. П., ЗЯНЕВІЧ П. Н. (Старобінскі); КІРЫЛАВА К. Я. (Слуцкі); ЛІЦВІНКА В. Д., ХАДНЕВІЧ С. І. (Талачынскі); ПАЛОЙКА З. М., ЦВІРКО І. К. (Уздзенскі); РОБЕРМАН М. Ц., БАНДАРЭНКА І. М., ЯКУБАЎ І. П., (Чэрскі); ІОХНЕВІЧ І. В., КАРОТЧЫКАЎ І. П. (Церахускі); АЛЕКСАНДРОВІЧ М. П., ЮРЧАНКА П. П. (Лоўскі); ЧЫГРАЙ А. В., ЯШАЎ Р. Э. (Чырвонапольскі); МАТУСЕВІЧ Я. М., НАВІЦКАЯ В. С. (Менскі); ВАРАБ'ЁЎ М. Ф., КРУМІНЬ Х. Х., ГАЎРЫЛЕНКА К. І. (Віцебскі); ЗАЛАТАРОЎ Н. Г. (Гомельскі); ЗАХАРЖЭЎСКАЯ (Дзяржынскі РК ЛКСМ).

АДДЗЕЛ КАДРАЎ ЦК КП(б)Б.

Менгарком КП(б)Б 19-га верасня, у 6 гадзін веч. склікае нараду жанпрагандыстаў.

Ніжэйпамянёныя т. т. павінны з'явіцца ў ГК КП(б)Б 19-га, у 6 гадз. веч., пакой 39.

ШУСТЭР, ПІНХУС (НКпрацы); БЕЛКІНА (Наркамюст); БЕРЛІНА (НКпрам); ШЛЫК (НКюст.); ЛІБО, КАГАН С. (ЦКК КП(б)Б); МАЙЗЕЛЬС, ШЧАРБАЦЭВІЧ, МАХЛІНА, ГУРОВІЧ Л. ЕРМАЛОВА, ДУБРАВЕНСКАЯ, ЯЗНІР (ЦОПСБ); ГУНДЗІНА, ШУБ, ЗАЙЦАВА (Наркамасветы); РОЗЕНБЕРГ (Метыз аб'яднанне); ЧЭКОРСКАЯ (НКФ; АЛЬТШУЛЕР (Наргасулік): ПУТЭРМАН, ТРОЦКАЯ (гарАНА); МЛОДЫЧАВА (Саюз пром. хар.); БАРКАН, ГАРЭЛІК (ЦП прам. хар.); КАБІНЦЭР (ЦП дзяржустаноў); КУЛЬБАК, ЭРЭНБУРГ (НКлегпрам); ЛЕВІНА (Бімза); ВЛАДЫКА (Дзяржплан); АЙЗЕНСОН («Прых. взяцей»); ЗАРЭЦКАЯ (МГРК); СУХАВЕЦ (курортбюро); ЛЕРНЕР (БКС); КАСЦЮК (ашчадкаса); ПРАКОФ'ЕВА (ЦП дзяржпрацоўшчыкаў); ЦЕБЛОЎСКАЯ (ЦП мясарыба); АКСЕЛЬРОД І., ПЯТРОВА, БАГДАНАВА, ГОЛАД (Белпрамхарч); КЛУБМАН С. (Ганоўдартранс); ГІНЗБУРГ (Белторф); ПЯТРОВА (НК снаб).

Менгарком КП(б)Б.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

ДЗЯРЖЦЫРК

Пачатак у 8 з пал. гадз. веч.

НОВАЯ ПРАГРАМА

АД І МАР—сатырыкі Лос-Амбатос—імп. ЛОПЕЙ-ДЭ-ЛОП Марціні | „Людзі мачыны“ 6 Маслюковых Юліанс Унівэрс. артысты

І яшчэ 10 новых нумароў.

Сёння 18 верасня РАНІШНІК пачатак у 7 г. дня

„Чырвоная Зорка“ Каса—ад 1 г. дня. Замежны мастацкі фільм НІБЕЛУНГІ 1-я серыя—„Зігфрыд“

Дзіцячы гульвы кіно тэатр МЯЦЕЖ паазіцыянцыю Д. Фурманава

Кіно Інтэрнацыянал Конрад Вейдт у фільме ЦІ НАВІНЫ ВЫ МАЎЧАЦЬ?

КІНО „Пролетары“ Замежны мастацкі фільм ПРАВІНЦЫЯЛ У СТАМБЫЛ Драма ў 6 частках

„СПАРТАК“ Штодзённа 5 сеансаў Каса з 4 г. дня З 17 верасня Замежны мастацкі фільм Дзеравы чалавек камедыя ў 6 частках

ЗАВОЧНЫ СЕКТАР вышэйшага педінстытуту абвяшчае ДАДАТКОВЫ НАБОР

на геаграфічнае аддзяленне. Прыём заяў да 1 кастрычніка. Прымаюцца заявы таксама на літаратурнае, гістарычнае і эканамічнае аддзяленні. Пачатак заняткаў 1 кастрычніка.

Завочны сектар ВПІ

Патрабуюцца ЭЛЕКТРОМ НЦЁРЫ для работы ў г. Менску, Віцебску, Гомелі і Магілеве.

Звяртацца ў Беларускае аддзяленне Электрапрома ВЭА, Менск, Савецкая, 50 і мантажныя канторы ВЭА ў Віцебску, Гомелі, Магілеве.

Электрапром ВЭА.

АД НАРОДНАГА КАМІСАРЫЯТА ФІНАНСАЎ БССР

Сіла наша ў тым, што мы будуем сацыялізм уласнымі сродкамі, „без кабальных крэдытаў і пазык звонку“. (СТАЛІН).

Пазыкамі і ўкладамі у ашчадкасу ўзмацнім гаспадарчую магутнасць і абароназдольнасць Краіны Совецкаў.

4-ты ТЫРАЖ ВЫЙГРЫШАЎ пазыкі 4-га ЗАВЯРШАЮЧАГА ГОДА ПЯЦІГОДКІ

адбудзецца 1-га і 2-га КАСТРЫЧНІКА г.г. у г. МЕНСКУ, У КЛУБЕ ХАРЧАВІКОЎ Ім. СТАЛІНА.

У ТЫРАЖЫ БУДУЦЬ РАЗЫГРАНЫ НАСТУПНЫЯ ВЫЙГРЫШЫ:

64 выйгрышы па 3.000 руб. | 16.000 выйгрышаў